ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №10 (86)
(кастрычнік)

www.lit-bel.org www. novychas. info

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»

Анонс

ПАМФЛЕТ



ЗАХАД ЦІ УСХОД?

Віктар САЗОНАЎ,
Беларускае Радыё Рацыя

«Вайна нішто, галоўнае манеўры». Гэтую фразу чуў хіба што кожны, каму хоць адну гадзіну давялося адслужыць у савецкім войску. Хаця там, звычайна, служылі не менш двух гадоў. І гэтая фраза тады гучала з салдацкім, не зусім цэнзурным вымаўленнем. Але сэнс застаўся гэткі ж. Па вайсковаму просты, як стрэл, лаканічны, як загад, і максімальна набліжаны да рэчаіснасці.

Дык вось, у Беларусі толькі што прайшлі вайсковыя вучэнні. І ўдзельнічалі ў іх не толькі беларускія вайскоўцы, але і расійскія. І нават кіраўнікі гэтых краін. Папрысутнічалі яны, адпаведна, на землях абодвух незалежных дзяржаў. І на сённяшняй расійскай тэрыторыі, якая дасталася Расіі па праву мацнейшага пасля перамогі над гітлераўскай Германіяй, і на беларускай зямельцы, якую не ўсю да канца, пасля той пераможнай вайны, саветы нахабна паразддавалі, каму хацелі. І невядома па якім праве.

Беларусь пасля тых сумесных з Расіяй ваенных дзеянняў стала ўнікальнай краінай-пераможцай, якая, у адрозненне ад іншых пераможцаў, не здабыла, а згубіла сваю тэрыторыю. Яшчэ сваю тэрыторыю таксама Германія страціла. Але яна, здаецца, у адрозненне ад нас, тую вайну прайграла.

Цяперашнія вучэнні назвалі «Запад-2013». Пісаць назву, напэўна, трэба выключна па расійску. Бо тое, што для іх «Запад», для нас акурат цэнтр Еўропы, які па волі лёсу ёсць нашай Радзімай. Асабіста я нават памятаю «манеўры» з падобнай назвай. Тады яны называліся «Запад-81».

> Жывём мы тут. Але ці насамрэч Расійская Федэрацыя чакае замежнай інтэрвенцыі з гэтага, заходняга кірунку, што і манеўры тут замуцілі, і вайсковую авіябазу пішчом пруць?

Праўда, «Запад», на думку савецкіх генералаў, тады быў значна далей на захад. Недзе пад мяжой з той самай Нямеччынай…

Тады ў краінах-удзельніцах Варшаўскай дамовы было ўжо вельмі неспакойна. І, верагодна, гэтая назва вучэнняў ім вельмі не спадабалася, бо яны сябе і так заўсёды лічылі «Захадам». Як і мы. І з Захадам ваяваць не збіраліся. Магчыма таму наступныя сумесныя вучэнні называліся ўжо то «Дружба», то «Шчыт». І аніякага «Западу». Хоць, калі быць да канца шчырымі, то і «шчыта» з імі ў СССР не атрымалася, а тым больш «дружбы».

Цяпер назва «Запад» зноў загучала. І гэтым разам ужо мы, Беларусь, ёсць Захад. Хоць мы і так даўно гэта ведалі. Як і словы заходняга класіка, што Захад ёсць Захад, а Усход ёсць Усход. І з месца яны не сыйдуць. Гэта нашым усходнім суседзям трэба вызначацца, хто яны. Але ж кіраўнік суседняй краіны так і не вызначыўся, назваўшы Расію і не Усходам, і не Захадам. Так і не здужаў зрабіць цывілізацыйны выбар.

Можа таму — з кім цяпер салдаты і афіцэры дзвюх суседніх краінаў ваявалі — разабрацца чалавеку недасведчанаму ў гіперсучасных вайсковых справах практычна немажліва. Хто наш верагодны супраціўнік, якая ў нас вайсковая канцэпцыя, ад каго мы мяркуем адбівацца, хто на нас нападаць збіраецца і чаму арэнай бітвы для беларусаў стала Калінінградская вобласць Расійскай Федэрацыі? — засталося неразгаданым. Як і тое, чаму мы вучымся ваяваць плячо ў плячо з войскамі той краіны, галоўнакамандуючы якой неяк заявіў, што хацеў бы Беларусь далучыць да сябе цалкам або часткамі. Калі мы такія моцныя і ўпэўненыя ў сваіх сілах і ані кроплі не баімся падобных пагроз, то трэба толькі радавацца. Але навошта тады некаму даваць падглядаць нашае дасканалае вайсковае майстэрства?

Зрэшты, калі краіна мае свае войскі, то яны мусяць вучыцца ваяваць. Гэта лагічна і правільна. І шукаць тлумачэння прысутнасці ў Беларусі беларускай арміі не трэба. Жывём мы тут. Але ці насамрэч Расійская Федэрацыя чакае замежнай інтэрвенцыі з гэтага, заходняга кірунку, што і манеўры тут замуцілі, і вайсковую авіябазу пішчом пруць? Няўжо і праўда — Еўропу падазраюць? А мо на ўсходнія свае землі ўжо рукой махнулі? Прыйшлі да высновы, што ўсё адно там парадку навесці не ў стане…


Ці, усё ж, маюць тут, у Беларусі, нейкія планы? Цікава, якія! Хоць калі падумаць, то можна і здагадацца.

Але ж замест бессэнсоўнай справы, ад якой яшчэ Кіплінг засцерагаў, вырашылі б лепш, хто яны самі. Усход ці Захад. І рухаліся б нарэшце ў абраным кірунку. Тады, можа, і манеўраў аніякіх не спатрэбілася б. Прынамсі тут, у Беларусі.

АНТАЛОГІЯ

СЛОВА ДА ПАНАВІТЫХ

Рыгор БАРАДУЛІН



Слова пашаны панавітым:
Дзеясловаўцы,
Шануйце слова,
Дзеяславаўцы,
Аблічце славу!
Шчыры ваш парыў
Абавязкова
Зацікавіць
Велічную справу.
Афіцэр-кампутар
Ці хлапчо-пяро
Беларускае нутро
Яшчэ глыбей
Абеларусіць
Старацца мусяць.

Новыя вершы народнага паэта Беларусі Рыгора БАРАДУЛІНА — яго хмельна-метафарную нізку «SEX-ЦЫКЛ» — чакайце, шукайце і чытайце ў наступным выпуску «Літаратурнай Беларусі».

САЮЗ



РАДА СБП

Адбылося паседжанне Рады ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў».

На парадку дня былі наступныя пытанні: прыём і аднаўленне ў арганізацыі новых сяброў і справаздача па дзейнасці Саюза за апошнія паўгады. Рада СБП таксама разгледзела пытанні аб працы Школы маладога літаратара і аб святкаванні 80-годдзя Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Празаікі Віктар Супрунчук і Андрэй Федарэнка выйшлі з альтэрнатыўнага СП і падалі заявы на аднаўленне сяброўства ў Саюзе беларускіх пісьменнікаў. Адкрытым галасаваннем іх заявы былі задаволеныя.

Шэрагі СБП папоўнілі таксама шэсць новаабраных літаратараў.

Яўгенія Яўгенаўна Казлова нарадзілася 6 мая 1949 г. у Вільні. Жыве ў Оршы. Скончыла Віцебскае медвучылішча, працавала ў Аршанскім гарадскім цэнтры гігіены і эпідэміялогіі на пасадзе памэпідэміёлага. З вершамі ў друку ўпершыню выступіла ў 1999 г. у «Аршанскай газеце». Аўтар дзвюх кніг паэзіі: «Спеў флейты» (2004) і «Мора любові» (2007).

Сяргей Аляксандравіч Календа нарадзіўся 15 сакавіка 1985 г. у Капылі на Міншчыне. Скончыў БДУ. Заснавальнік і рэдактар часопіса сучаснай беларускай прозы «Макулатура». Стыліст міжнароднага класу (у 2008 годзе закончыў Toni&Guy Academy, Лондан). Аўтар пяці кніг прозы: «Помнік атручаным людзям», «Казкі. Гісторыі (не) пра нас», «Іржавы пакой зь белымі шпалерамі», «Трохлітровая проза», «Кантынэнтальны сьняданак».

Анатоль Станіслававіч Кашэвіч нарадзіўся 28 чэрвеня 1937 г. у в. Крушнікі Петрыкаўскага (сёння — Мазырскага) раёна. Скончыў Мінскі педінстытут. Больш за сорак гадоў працаваў настаўнікам, з іх каля трыццаці — дырэктарам школы. Выдатнік Асветы СССР і БССР. Мае медаль «За выратаванне тапельцаў». Аўтар дакументальных аповесцяў «На куранях», «Уратуйце нашы душы», «Залатое вяселле», «Дзед Міколік».

Міхаіл Саламонавіч Нардштэйн нарадзіўся 24 студзеня 1924 г. у м. Абчуга Крупскага раёна Мінскай вобласці. У 1952 г. скончыў Маскоўскі гісторыка-архіўны інстытут, працаваў у Мінусінску супрацоўнікам дзяржархіва, пазней быў пераведзены ў Енісейскі дзяржархіў. У 1955-м скончыў Хабараўскае артылерыйскае вучылішча. З 1961 г. — ваенны журналіст, 15 гадоў адпрацаваў у Беларускай вайсковай акрузе. У 1989–1991 гг. быў спецкарам рэспубліканскай газеты «Знамя юности», у 1992–1999 — галоўны рэдактар яўрэйскай рэспубліканскай газеты «Авив». Аўтар кніг у 2-х тамах «Рубиконы. Очерки одной жизни и не только» (2008).

Мікалай Іванавіч Пацяюк нарадзіўся 24 снежня 1938 г. у в. Ляхаўцы Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласці. Скончыў Маларыцкую СШ, Гродзенскае музычна-педагагічнае вучылішча, філалагічны факультэт Брэсцкага педагагічнага інстытута. Працаваў настаўнікам музыкі і рускай мовы і літаратуры. Аўтар двух паэтычных зборнікаў: «Мелодыя сэрца» і «З-пад буслінага крыла».

Сяргей Іванавіч Сапоненка нарадзіўся ў 1966 г. у Гомелі. Рэдагаваў і рыхтаваў да друку газету гомельскага таварыства інвалідаў «Сям'я». Аўтар паэтычных зборнікаў «Versus» і «Песні Сіёна» (галандскае выдавецтва «DRTS»), зборніка вершаў у 2-х тамах «Сэрца на паперы» (нямецкае выдавецтва «TITEL»).

Прэс-служба ГА «СБП»

ЗАЯВА
Сакратарыята ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў»

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь прыняло рашэнне (№189 ад 25 верасня 2013 года) правесці скарачэнне колькасці работнікаў устаноў культуры.

Сярод прапанаваных мераў – скарачэнне на 20% колькасці кіраўнікоў і спецыялістаў мясцовых органаў у сферы культуры. Літаратурны музей Максіма Багдановіча і Літаратурны музей Петруся Броўкі плануецца далучыць да Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, пазбавіўшы статуса самастойнай юрыдычнай асобы. Штат Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа і Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы скарачаецца на 25%.

Гэтыя сумнёўныя меры па «аптымізацыі штатнай колькасці работнікаў» варта разглядаць не як паасобныя праявы чыноўніцкай «ініцыятывы», а як сістэмную з'яву і дзяржаўную палітыку, якая разам са скарачэннем колькасці гуманітарных дысцыплінаў ва ўстановах адукацыі, закрыццём бібліятэк і сельскіх устаноў культуры вядзе не толькі да занядбання беларускай культуры, мовы і літаратуры, але і да планамернага і паслядоўнага размывання самой нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў.

Мы разумеем, што гэтыя меры Міністэрства культуры выкліканы няпростым становішчам у эканоміцы краіны, аднак лічым, што нацыянальная культура – не тая галіна народнай гаспадаркі, на якой варта і можна эканоміць. У сувязі з гэтым Сакратарыят ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў» звяртаецца да калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь з прапановай устрымацца ад такіх сумнёўных мераў «аптымізацыі», якія ў перспектыве толькі ўзмоцняць крызісныя з'явы ў нацыянальнай культуры, і адклікаць сваё рашэнне.

КОНКУРС

УГАНАРАВАННЕ ФІНАЛІСТАЎ «ЭКСЛІБРЫСА»

12 кастрычніка адбылося ўрачыстае ўзнагароджанне лаўрэатаў конкурса «Эксылібрыс» імя Янкі Маўра, прысвечанага літаратуры для дзяцей і праведзенага Саюзам беларускіх пісьменнікаў.



Пераможцы атрымалі дыпломы і падарункі, каштоўныя прызы ад кампаніі «Прэстыжыо», а самай маладой фіналістцы, якая пакарыла журы, аказалася ўсяго 13 гадоў.

На конкурс прыйшло 117 заявак. Сярод удзельнікаў — жыхары Беларусі, Расіі, Украіны, Балгарыі ва ўзросце да 40 гадоў. Канкурсанты прапанавалі творы ў самых розных жанрах — казкі і п'есы ў вершах, тэксты песень для дзяцей, апавяданні ў стылі фантастыкі, фэнтэзі або на аснове фальклору, коміксы, ілюстраваныя аповесці і раманы і нават цэлыя праекты кніг.

Уладальнікам трэцяга месца стаў **Серж Мядзведзеў** з перакладам «Чараўніка краіны Оз» Фрэнка Баўма. Для лаўрэата быў перададзены дыплом, а таксама падарункі ад СБП — усе кнігі серыі «Пункт адліку», кніга Эвы Суса «Снежны чалавек» у перакладзе на беларускую Алесі Башарымавай, а таксама прыз ад партнёраў конкурсу – рыдэр Prestigio на электронных чарнілах.

Другім месцам была ўганараваная **Дар'я Вашкевіч** з казкай «Баваўняная дзяўчынка» (твор ілюстраваны мастачкай Аленай Медзяковай). Пераможца атрымала рыдэр і магчымасць выдаць кнігу.

А першае месца атрымала **Вольга Гапеева** з казачнымі гісторыямі «Сумны суп», а разам з ім — планшэт ад кампаніі «Prestigio» і выданне кнігі.

Яшчэ 9 фіналістаў сталі дыпламантамі конкурса «Эксылібрыс»: Мілана Пасанен з дзённікавымі гісторыямі «Королева рулета»; Сяргей Календа супольна з Дашай Зайчанка і Лідай Наліўка за праект кнігі «Дзе жывуць беларускія пачваркі»; Надзея Кандрусевіч (за пераклад твора Сары Лундберг «Віта Белая Крэска» са шведскай на беларускую мову); Павал Касцюкевіч (пераклад «Аўтаспынам па Галактыцы» Дугласа Адамса); Алесь Квіткевіч (пераклад першай кнігі «Хронікі Нарніі» Клайва Стэплза Льюіса); Глеб Лабадзенка з кнігай дзіцячых моўных малюнкаў «дзіцячая заМова» (і з працягам гэтага праекта); Элеанора Ляхновіч (напісала казку «Турба-Элік і яго сябры», а таксама ілюстравала яе); Наталля Рудак з перакладам «Маленькай вядзьмаркі» Отфрыда Пройслера і Ксенія Шталянкова з працягам прыгодніцкага рамана для падлеткаў «Адваротны бок люстра».

ЛІСТАПАДАЎСКІЯ ЮБІЛЯРЫ

У наступным месяцы адзначаюць юбілеі сябры Саюза беларускіх пісьменнікаў:

01.11.1948 — Мікалай Пракаповіч
12.11.1958 — Леанід Пранчак
20.11.1953 — Міхась Шаховіч
21.11.1958 — Вера Стрмакоўская
24.11.1958 — Ігар Тумаш



Жадаем усім радасці, натхнення і дабрабыту!

MEMORIA

ПАМЁР НОРБЕРТ РАНДАЎ



1 кастрычніка спачыў у вечнасці нямецкі славіст, перакладчык, ганаровы сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў і Беларускага ПЭН-цэнтра Норберт Рандаў.

Ён нарадзіўся 27 лістапада 1929 г. Вывучаў славістыку ў Растоку і Берліне. Закончыў аспірантуру ў Сафіі. Займаўся мастацкімі перакладамі з балгарскай і беларускай літаратур.

У 1962 г. спецслужбы прасавецкай Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі знайшлі на кватэры Н. Рандава кнігу Пастэрнака «Доктар Жывага» і абвінавацілі славіста ў антысавецкай агітацыі, а таксама ў «антыдзяржаўным падбухторванні» і «дапамозе нелегальнай эміграцыі». З 1962 па 1965 гады Н. Рандаў быў у зняволенні. Да 1989 г. штазі не дазваляла яму пастаяннай працы і сачыла за ім.

Н. Рандаў перакладаў творы Якуба Коласа, Янкі Купалы, Алеся Гаруна, Максіма Гарэцкага і Васіля Быкава, з якім быў асабіста знаёмы.


У 2003 г. Н. Рандаў дапамог у знаходцы ў нямецкім горадзе Гёрліц асобніка Бібліі Францыска Скарыны і пазней выступіў з навуковым дакладам з гэтай нагоды.

Ягоны пераклад аповесці Максіма Гарэцкага «Дзве душы» дагэтуль не выдадзены. Нямецкі журналіст Інго Пэтц паведаміў, што Рандаў называў "Дзве душы" ключавым творам беларускай літаратуры. Пэтц прызнаўся, што яму на ўсё жыццё запомніліся словы Рандаў: «Гэта скандал, што мы на Захадзе нагэтульскі сляпыя ў дачыненні да беларускай літаратуры, якая ёсць неад'емнай часткай еўрапейскай культурнай гісторыі».

Добрая памяць аб удумлівым працаўніку хай навечна застанецца ў беларускіх сэрцах!

ПАМЁР МІКАЛАЙ ВІНЯЦКІ

14 кастрычніка пайшоў з жыцця беларускі паэт Мікалай Віняцкі.



Мікалай Фёдаравіч Віняцкі нарадзіўся 13 красавіка 1939 года ў вёсцы Чыгірынка Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці. Працоўны шлях пачаў тапографам. Скончыў БДУ, аспірантуру пры Беларускім тэхналагічным інстытуце. Кандыдат тэхнічных навук. Да выхаду на пенсію працаваў галоўным рэдактарам Беларускага картографа-геадэзічнага аб'яднання «Белгеадэзія». Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Сярод літаратурных дасягненняў Мікалая Фёдаравіча можна вылучыць стварэнне вянка вянкоў санэтаў. Акрамя таго аўтар выкарыстоўваў у сваёй паэзіі цэлы шэраг экзатычных жанраў: тэрцэты, квінцілы, секстыны, септымы, ноны, дзцымы.

ЮБІЛЕЙ

БЕЛАРУСКІЯ ЛАБІРЫНТЫ

ДЗЯРЖАВАТВОРНАЯ КАНЦЭПЦЫЯ ВАЦЛАВА ЛАСТОЎСКАГА

Алік АКУЛІЧ

Станаўленне беларускай дзяржаўнасці адбывалася ў ідэйным суплёце з развіццём мастацтва: палітыка ядналася з творчасцю. Беларуская літаратура з пачатку ХХ стагоддзя прапагандавала два асноўныя канцэпты мадэлі нацыянальнага дзяржаваўладкавання, натхнёна запазычаныя са спратаў гісторыі: Крывію (старажытнае Полацкае княства) і Вялікае Княства Літоўскае.



Вацлаў Юстынавіч Ластоўскі — паэт, празаік, драматург, публіцыст, літаратуразнаўца, гісторык, выдавец, палітык, дыпламат — нарадзіўся 130 гадоў таму; у 35 стаў кіраўніком БНР (старшынёй Рады, прэм'ер-міністрам), у 45 — акадэмікам Акадэміі навук Беларусі; знішчаны бальшавіцкай уладай у 55-гадовым веку і рэабілітаваны яе спадчыннікамі адным з апошніх — праз 50 гадоў пасля расстрэлу. На скрыжалях Беларускай Кнігі пад ягоным імем гісторыяй навечна ўпісаны словы-вызначэнні: творца і дзяржаўнік.

Адным з першых мастацкую праграму ўсведамлення будучага беларускай краіны праз асэнсаванне яе мінуўшчыны прапанаваў пісьменнік-энцыклапедыст, палітык еўрапейскага маштабу Вацлаў Ластоўскі. Галоўная ідэя яго твораў — адраджэнска-нацыянальная, а тэма — сцвярджэнне самабытнасці беларускага народа. Болесныя роздумы над лёсам Бацькаўшчыны прывялі В. Ластоўскага ў пракаветныя лабірынты-таямніцы беларускай душы — у міфічную Крывію. Яго найболыш вядомы празаічны твор — аповесць «Лабірынты» — стаў узорам рамантычнай прозы на гістарычную тэму. Аднак, думаецца, гістарызм «Лабірынтаў» — ужо «паслявальтэрскотаўскі», гістарызм найперш інтэлектуальны, бо на парозе ўжо было ХХ стагоддзе, самы яго разгар, і таму проза В. Ластоўскага 20-х гадоў адчувала павевы новага мастацкага мыслення, звязанага з эпохай мадэрнізму. Тыя павевы мадыфікавала ўласная нацыянальная глеба, напаўнялі змястоўнасцю задачы новага беларускага адраджэння і адпаведныя гісторыка-культурныя асацыяцыі. «Лабірынты» — сплаў філасофска-культурных напрацовак (да ўсяго — мінітрактатаў па гісторыі сусветнай міфалогіі, народнай астраноміі, этнаграфіі) і мастацкай містыфікацыі гісторыка-міфалагічнага кшталту, духоўная аснова беларускай Крывіі, адна з першых фундаментальных мастацкіх канструкцый нацыянальнай канцэпцыі быцця.

Шмат у чым аўтабіяграфічнаму герою «Лабірынтаў» у круглай падземнай «салі» адкрыўся пракаветны алімп дахрысціянскіх продкаў: славянская Троіца і «сем галоўных сіл, уладаючых светам»: Кон (Конязь) з сімвалам сонца, Княжыч (Месяц) з сімвалам маладзіка, Ярыла з сімвалам Марса, Радзігост з сімвалам Меркурыя, Пярун-Грамавік, Грамавіца з сімвалам Венеры і Лада (Ладон) з сімвалам Сатурна. «Ніжэй гэтых сямёх асоб маецца дванаццаць сімвалаў, азначаючых дванаццаць знакаў Задыяка, а пад імі — чатыры вятры, бытуючыя на чатырох канцах зямлі <...> У самым нізе было <...> царства смерці, дом вечнай цемры з яго жыхарамі. На першым плане былі дзве галоўныя фігуры: Люцец, Люты (Pluto), або Кашча Бяссмертны, і яго жана — Марва».

Міфалагічныя, тэасофскія, фальклорныя, навуковыя і ўласна-мастацкія штудыі ў «Лабірынтах», па вялікім рахунку, былі скіраваны на асвятленне актуальных праблем сучаснасці, яны, як адчуваў і сам В. Ластоўскі, дапамагаюць раскрываць «сімвал пройдзенай народам гісторыі». «Нягледзя на тое, што даўно па-свойму рашыў Юпітэр зямельнае права, права гэта да сягоння несправядлівае. І будзе датуль актуальным, пакуль кожны народ не станецца гаспадаром у сваім краі, — наўпрост выводзіць В. Ластоўскі паралелі ў сваю рэальнасць, — пакуль кожны, хто палівае сваім потам загон, не будзе праўным, прызнаным і ўсёвячоным правам яго валадаром. Гэты ж час ужо недалёк!».

Таму, думаецца, называць «Лабірынты» В. Ластоўскага ўтопіяй (як выказваліся некаторыя навукоўцы) можна толькі ў вузкалітаратурным значэнні, бо традыцыйная філасофская трактоўка паняцця ўтопіі — як мадэлі прыдуманага ідэальнага грамадства — аніяк не магла адпавядаць задумам і ідэям В. Ластоўскага, які, выпісваючы ў «Лабірынтах» мадэль-ідэал духоўнага і сацыяльнага ўладкавання сваёй краіны, хоць і з рамантычным, ідэалістычным флёрам, усё ж высільваўся пераканаць у непрыдуманасці, колішняй рэальнасці, фундаментальнасці вымалёванай мадэлі быцця, пераканаць у яе трывалых падмурках, якія закладваліся цягам доўгіх стагоддзяў і працай (найперш духоўнай) многіх пакаленняў крывічоў-беларусаў. Менавіта адсюль у аповесці — шмат спасылак і зносак на навуковыя працы, «рэдактарскія» прыпісы,

> **Крывія — на стагоддзе шырэйшая і на пакаленні багацейшая ў сваёй адраджэнска-эстэтычнай сутнасці мастацкая трансфармацыя беларускай нацыянальнай ідэі**

угрунтаваны тэрміналагічны апарат, насычанасць сімволікай, паняццямі міфалогіі, эзатэрыкі. Больш правільна, думаецца, пра «Лабірынты» трэба гаварыць як пра нацыянальную містэрыю, дзе апісаны народны духоўны космас і асноўныя вехі нацыянальнага культурнага станаўлення, як пра адмысловую нацыянальную практопію, створаную на аснове старажытнай беларускай гісторыі.

Калі бальшавіцкая дагматыка пачала, прафануючы, дапасоўваць беларускую нацыянальную ідэю да ідэалогіі прарасійскай БССР, некаторыя беларускія творцы (і адным з першых В. Ластоўскі), адчуўшы фальш і падман, сталі выяўляць нацыянальную ідэю ў вобразе міфічнай Крывіі. Крывія — тая міфапрастора, якую ўжо не маглі ні паланіць, ні скарыць аніякія чужынцы. Крывія для беларускіх творцаў — як вечны Акропаль для грэкаў. Крывія — і ўсё тыя ж духоўныя лабірынты, і духоўны супраціў, эміграцыя ў саміх сябе. Крывія — на стагоддзе шырэйшая і на пакаленні багацейшая ў сваёй адраджэнска-эстэтычнай сутнасці мастацкая трансфармацыя беларускай нацыянальнай ідэі, — у параўнанні з «лабірынтамі» творцаў XIX стагоддзя. Філаматы і філарэты, Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Тамаш Зан і іншыя, у выглядзе ліцвінізма патэнтавалі адно своеасаблівую мутацыю старабеларускасці і нацыянальнай ідэі, «крывізм» жа на пачатку 20-х гадоў ХХ ст. рабіўся новай сімвалічна абгрунтаванай канцэпцыяй нацыянальнага быцця беларусаў.

Адной з частак аповесці «Лабірынты», яе ўмоўным працягам (ці, правільней, пачаткам) можна лічыць і «Расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік» В. Ластоўскага. Гэта — біблія крывіцкай душы, якая яшчэ раз «узаконьвала» думку аб тым, што «ісконе бе слово» і на пачатку кожнай нацыі была мова. Прадмова да «Слоўніка» В. Ластоўскага (па сутнасці — верш у прозе) стала шыфрам-ключом да ўсёй працы. У прадмове тэзісна выкладзена — па перыядах — уся гісторыя «Крывіі»: «На зарані гістарычных часоў наш народ выступае як сарганізаванае цэлае, нацыянальнае і палітычнае, пад найменнем Крывічы. <...> у перыёд ад прыняцця хрысціянства да запанавання новай, літоўскай дынастыі, наступае замяшанне ў паняццях: народ Крывічы, якім яго ўсе кругом называюць, хочучы адзначыць сваю прыналежнасць да хрысціянства ўсходняга абраду, мянуе сябе <...> Русамі, Руссю». Крыўска-рускую дынастыю, паводле Ластоўскага, у XIII стагоддзі змяняе літоўская, замест наймення «Крывічы» пачынае ўжывацца «Літва». Гэта — другі перыяд, «які трываў немаль да канца XVIII ст. <...> Дзяржаўна — Літва, па веравызнанню — Русь. Па гэтай старой памяці ў палудгёвых і ўсходніх паветах <...> дагэтуль наш народ называе сябе Літвінамі». Трэці перыяд у гісторыі развіцця беларуска-крыўскага народа, на думку В. Ластоўскага, быў літоўска-польскім, калі беларуская шляхта пачувалася патрыётамі літоўскімі, «а па культуры і веры мела сябе за палякаў». Пад расійскім панаваннем праходзіў перыяд чацвёрты — расійска-беларускі, калі «ад народу адпадае рэшта грамадскіх вярхоў, тонучы ў расійскай самадзяржаўнасці і называючы сябе <...> «рускімі»<...> Гэты перыяд замацаваў яшчэ адно найменне — Беларусы».

Распачынаючы новую хвалю беларускага нацыянальнага Адраджэння, В. Ластоўскі імкнуўся (у некаторых выпадках нават і праз містыфікацыю) выявіць канцэптуальныя першавыткі станаўлення нашай дзяржаўнасці, высвеціць да самых «каранёў» нацыянальную ідэю. «Цяперашняе нацыянальнае адраджэнне нашае пачалося не са старых абсохшых галін, а з каранёў народных, — пісаў ён у той жа «Прадмове». — <...> не выракаючыся культурных здабыткаў, прыдбаных у нашу нацыянальную скарбніцу пад найменнем «Русь», «Літва»<...>, хочучы быць самастойным славянскім народам, выносіць з гісторыі нашай і нашага народу на свет прастарое племяннае і нацыянальнае сваё найменне — Крывічы».

Сваю крыўскую ідэю В. Ластоўскі працягваў развіваць і ў навукова-папулярных артыкулах: «Крыўскі варыянт быліны аб Ільлі Мурамцы» (1924), «Крыўскі (Беларускі) старадаўні лістоўны стыль» (1924), «Аб назовах «Крывія» і «Беларусь»» (1925). Апошні найбліжэй стаіць да згаданай «Прадмовы», датлумачвае і пашырае яе высновы: «Жаданне паставіць на годную вышыню імя «крывічы» лагічна выплывае з разумення адраджэнча-нацыянальнага руху <...>. Крыўскае адраджэнне ад сваіх першых пачаткаў мае на мэце злучыць разбіты гістарычнымі падзеямі вялікі і слаўны крыўскі народ духова і фізічна <...>. Як «беларусы» мы — толькі адбіццё агульнарускай індывідуальнасці, нейкі «промежуток и недоумок», але як «крывічы» — мы асобны індывідуум, асобнае славянскае племя са сваёй багатай мінуўшчынай, сваёй асобнай мовай, тэрыторыямі і духовай творчасцю».

Ідэі В. Ластоўскага ў многім прадвызначылі кірункі далейшага развіцця беларускай літаратуры. Крывія В. Ластоўскага займела сотні прадаўжальнікаў — як у тэарэтычна-навуковым, так і ў «практычна-літаратурным» увасабленні, займела сотні адданых «грамадзянаў»: ад узвышаўцаў У. Дубоўкі і У. Жылкі да літаратараў канца ХХ ст.

В. Ластоўскі ўпершыню ў беларускай літаратуры, узвысіўшыся над простай аналітычнай ілюстрацыйнасцю, даў грунтоўнае, цэльнае і кампактнае ўвасабленне нацыянальнай канцэпцыі быцця, фундаментальнымі катэгорыямі якой выводзіліся міфалагічнае светабачанне, гістарычная самасвядомасць, актыўнае выкарыстанне дасягненняў традыцыйных навук (з пераважным акцэнтам культуразнаўчай галіны), родная мова і, як неадменны сацыяльны і культурны гарант, — незалежнае дзяржаўнае існаванне ў дзейсным сусветным узаемаабмене матэрыяльнымі і культурнымі набыткамі.

ВАНДРОЎКІ

У КРАІНЕ КАМЯНЁЎ І ФІЁРДАЎ

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ



Гэта сапраўднае свята дэмакратыі, дзе кожная з асноўных партый прадстаўляла сваю праграму, дзе выступілі лідэры і кандыдаты ў парламент

Пералёты

Дабіраліся мы ў Нарвегію з двумя перасадкамі і трыма авіяпералётамі. У Рызе доўга чакаць наступнага рэйсу не давялося. І дзякаваць Богу, бо нагрэты трыццаццю градусамі аэрадром дыхаў пякельнай спёкай. Нават вецер там быў гарачым, быццам у якойсьці Сахары.

Дацкі аэрапорт больш нагадваў рэспектабельны гандлёвы цэнтр з фірмовымі буцікамі і шматлікімі кавярнямі. Адны пасажыры спяшаліся на рэгістрацыю з чамаданамі на колцах, другія бавілі час за прысмакамі, размовамі або пакупкамі. Уражвала разнастайнасць людскога патоку, дзе прысутнічалі ўсе зямныя расы, прыцягвала пагляд упэўненасць і саліднасць мужчын у дарагіх касцюмах.

Пазней мы даведаліся, што з дацкага аэрадрома можна пабачыць Швецыю. Швецыя і Данія нашмат бліжэй для нарвежцаў, чым поўнач уласнай краіны, дзе карэннае насельніцтва — саамы. Тады нам было не да геаграфіі, бо стомленыя, пацёпваючыся ад ветру, гуськом і пешкі мы падаліся на пасадку. Усё было неяк пахатняму, па-простаму, як бывае на аўтастанцыях у мястэчках. Пасажыры ўжо не тыя, што на версе сацыяльнай лесвіцы, — выглядаюць цалкам дэмакратычна. Тым не менш, прыкметна, што карыстанне авіяпералётамі для іх — звычайная справа.

Чарговы борт належаў іншай, больш заможнай фірме, якая прапанавала жадаючым вячэру і нават выпіўку ў міні-пляшачках. Сусед маладзейшага з нашай дэлегацыі аказаўся ўкраінцам, які перавучыўся і здабывае ў Нарвегіі газ. Ён лятаў на радзіму праведаць бацькоў. Хлопцы добра паразумеліся, гаворачы кожны на сваёй мове. Ад высознага сцюарда (як толькі месціцца ў самалёце?) упершыню пачула нарвежскую мову — мяккую, плаўную і зусім не падобную на нямецкую, хоць і адносіцца да германскай групы. Англамоўныя фармальнасці ніхто ўжо не захоўваў.

Над хмарамі яшчэігралі апошнія прамені, але пры зніжэнні, прарэзаўшы воблачнасць, мы апынуліся ў вечаровым змроку. Пад крылом было фантастычнае відовішча: з блізкага мора выплываліся круглыя, як шапкі грыбоў або як пухіры, чорныя выспы. Кожная такая выспа, усыпаная агеньчыкамі паселішчаў, сведчыла пра абжытасць людзьмі. Берагавая лінія захаду Скандынаўскага паўвострава на карце выглядае карункавай. Як быццам неадольная сіла падрала яе пры нацяжэнні на дробныя шматкі ды раскідала іх бліз берага.

Нарвегія — нагор'е з гнейсу і граніту. «Хто-небудзь лічыў, колькі ў вас астравоў?» — спыталася я на прыёме ў мэрыі горада Ставангера. Намеснік мэра хуценька пагугліў і выдаў лічбу: 240 тысяч з улікам зусім непрыдатных для жыцця. Здаецца, ён сам уразіўся такой колькасці. Дарэчы, мэрам у Нарвегіі з'яўляецца не старшыня выканкама, як у нас, а старшыня гарадскога савета. Але пра гэта, як і пра многае іншае, мы даведаемся пазней.

Дачы

Наша невялікая дэлегацыя з чатырох чалавек правяла ў Нарвегіі поўных пяць дзён. Нас прымала партыя-партнёр БХД — Хрысціянская народная партыя (KrF) з нагоды пачатку блізкіх парламенцкіх выбараў. Наш візіт пачаўся з усходняй часткі краіны, дзе нас размясцілі ва ўтульным дачным доміку. Знешне ён зусім някідкі, дашчаны, але аказаўся цалкам прыдатным для жыцця, з цёплай вадой і астатнімі зручнасцямі. Тэраса, дзе мы пілі ранішнюю каву, падперта сваямі, як і ў многіх іншых жылых будынках, і ўпісана ў навакольны рэльеф. Зусім блізка марская прастора з нязменнымі прыбярэжнымі астравамі. Да камяністага груваткага берага падысці складана.

Участак мінімальнага памеру і не абазначаны. Вакол буяюць ядловец, глог, кашлатыя дубкі з круглымі малымі жалудамі. Ніжэй па схіле ўзвышаюцца сосны. Цвітуць верас і скрыпень. Навакольныя катэджы ўпрыгожаны дэкаратыўнымі кустамі, кветкамі, абсталяваны дзіцячымі пляцоўкамі. Ні садоў, ні тым болей градаў мы не заўважылі. Як, зрэшты і жыхароў. Людзі сустрэліся толькі на далекаватым пляжным беразе, куды вядзе звілістая, з плаўным сыходам сцежка. Што некаторыя тут жывуць стала, сведчылі паштовыя скрынкі на пачатку вуліцы.

Дачны домік невядомага нам нарвежца пры ўсёй сваёй сучаснасці нагадваў маленькі музей. Драўляная — пад старызну — нелакаваная мэбля, мацерчаты дыванок на сцяне, паліца-выстава бабуліных талерак, старасвецкага выгляду завесы на вокнах, паліцы старых кніжак выдання 40-70 гадоў мінулага стагоддзя. Заўважце: літаральна ўсе — нарвежскіх аўтараў. І на стале — карта Нарвегіі з яе пасечанымі фіёрдамі берагамі.

З усходу на захад

Праз два дні нас везлі з усходу на захад, агінаючы паўднёвую мяжу краіны, па звілістай дарозе з тунэлямі і абмежаваннем хуткасці да 70 км. Мэта нашага пераезду — нафтава-прамысловы горад Ставангер, цэнтр вобласці Рагаланд. Пры апытанні жыхароў горада, праведзеным партыяй, у якасці асноўнай праблемы яны назвалі якраз транспарт. Паромы цераз фіёрды хоць і надзейны від перамяшчэння, але марудны. Вось чаму не толькі пад скаламі, але і пад камяністым марскім дном пракладваюцца рознай даўжыні тунэлі і дзейнічаюць 53 аэрапорты.

Па меры руху асобныя скалістыя глыбы ператвараліся ў сапраўдныя горы — альбо лысаватыя, альбо зарослыя лесам. Горы рабіліся ўсё вышэйшымі, вузкімі рукавамі ў далінах выцягнуліся не то азёры, не то рэкі. Там усё месціцца сярод каменю і чапляецца за яго: дрэвы, жывёлы, людзі… І ўсё, як ні дзіўна, выжывае і знаходзіць сабе нішу для існавання. Далей паабапал дарогі пачалі сустракацца статкі жывёл. Пераважалі рудыя або бела-рудыя, мясцовай пароды каровы. Авечкі не горш за козаў скакалі па россыпах валуноў. Успомніўся жарт эколага, пачуты там жа на семінары: «Калі ў Нарвегіі ўсяго 30 ваўкоў, то чаму так стогнуць фермеры?»

Фермы, напэўна, размяшчаліся ў зацішных, захінутых гарамі куточках, бо трактароў і іншай сельгастэхнікі на прыдарожных сядзібах не назіралася. Поўдзень краіны лічыцца прыдатным для развіцця сельскай гаспадаркі з-за ўмеранага вільготнага клімату і ўрадлівай глебы. Вышэй на карце размешчана самая паўночная кропка Еўропы, дзе сеюць жыта. Сельгаспалеткі забаронена займаць пад новабудоўлі. Каб падрыхтаваць глебу для выкарыстання, камяні выворваюць, як карняплоды, і выкладваюць на межах доўгімі буртамі. Мясцовы будаўнічы матэрыял шырока выкарыстоўваецца як у будоўлі, так і ў афармленні ландшафту. Падпорныя сценкі з колатых глыбаў, кветнікі ў атачэнні камянёў, абкладзеныя бутам дрэвы, эфектныя прыродныя гіганты ў межах паселішчаў, абыграныя архітэктарамі, — усім гэтым я не пераставала дзівіцца і любавацца, бясконца шчоўкаючы з акна аўто сваім лічбавым фотаапаратам. Не паспееш адключыць і пакласці на калені, як адкрываецца новы непаўторны краявід з домікамі на верхатуры, рознага колеру скаламі, воднай паласой уздоўж трасы, ліловай палянай скрыпеню або тунэлем. Таварышы пасмейваліся з мяне: «У Галіны фотазалежнасць». Яны не ведалі, што ў мяне літазалежнасць: даўняя незразумелая ўлюбёнасць у камень ва ўсіх яго выглядах.

Яшчэ сотня кіламетраў — і новая змена рэльефу: як бы стаміўшыся ад уласнага цяжару, горы пачалі скідваць, ссыпаць з сябе каменныя крушні. Потым яны ўвогуле расступіліся, адкрыўшы вачам панараму горада, да якога мы рухаліся.

Людзі і грамадства

Такую ж велічную панараму Ставангера назіралі мы з акна дома нашага апекуна, старшыні абласнога аддзялення KrF Улафа. Пакуль яго ветлая жонка гатавала традыцыйныя нарвежскія вафлі, мы распытвалі гаспадара. Сцены ўпрыгожвалі па-мастацку аформленыя здымкі сям'і: ад вясельнага да дзяцiных. Вось дзеці зусім малыя, вось падлеткі з усмешлівымі тварамі… Цяпер двое сыноў і дачка Улафа ўжо юнацкага ўзросту, становяцца на крыло.

Загаварылі пра нацыянальныя строі. Улаф прыносіць свой: з караткаватым чорным каптанам, аздобленым срэбранымі гузікамі, з камізэлькай, якая ўжо не захацела сыходзіцца на стане, з шарсцянымі гетрамі, што адзяюцца пад кароткія — да каленяў — штаны. Дзяўчаткам спраўляюць строі адразу пасля канфірмацыі. (Нагадаю, што нарвегі спавядаюць лютэранства.) Хлопчыкам — пазней, бо яны марудней растуць. Такі строй захоўваецца ўсё жыццё і лічыцца прадметам гонару.

Нам давялося назіраць старт выбарчай парламенцкай кампаніі ў дзвюх абласцях каралеўства, якія на рускамоўным сайце чамусь называюць губернiямі. Гаспадарам было што паглядзець. Уразіла прэзентацыя партый на галоўнай плошчы горада Арэндаля. Гэта сапраўднае свята дэмакратыі, дзе кожная з асноўных партый прадстаўляла сваю праграму, дзе выступілі лідэры і кандыдаты ў парламент. І ніводнага «стража парадку»! Нават для прылiку ніхто не таптаўся з дубінкай ці без…

На прыёме ў мэрыі горада Ставангера мы пацікавіліся сістэмай адукацыі. За тры старэйшыя класы сярэдняй школы бацькі даплочваюць невялікія грошы. Вышэйшая адукацыя цалкам бясплатная, пры гэтым студэнты не атрымліваюць стыпендыі. Школьнікі да 15 гадоў бясплатна карыстаюцца транспартам, студэнты маюць на праезд льготу. Прадугледжана навучанне для зняволеных і для тых, хто працяглы час знаходзіцца ў шпіталі.

Сацыяльная абароненасць моладзі мае свае мінусы: даволі частыя выпадкі, калі школьнікі не заканчваюць вучобу. А пасля, як хтосьці пажартаваў, «тры гады гуляюць у камп'ютэр і атрымліваюць за гэта грошы». Іх пасля цяжка сацыялізаваць.

Вобласць Рагаланд, дзе хрысціянскія дэмакраты маюць найбольшую падтрымку, лідзіруе па тэмпах росту насельніцтва і таму мае дадатковае месца ў парламенце. У апошнія дні нашага гасцявання мы наведалі раён Цюсвар, што размешчаны на востраве. Дабіраліся туды цераз два падводныя тунэлі, потым на велічным няспешным пароме, пасля цераз некалькі астравоў, злучаных мастамі, дзе горы (ну як жа без іх?) густа парaслі рабінамі, ядлоўцам і верасам.

Згодна рэйтынгу ААН, Нарвегія знаходзіцца на першых пазіцыях сярод самых шчаслівых краін свету. І сапраўды — я не ўбачыла панурых твараў, патухлых вачэй, апушчаных галоў… Узіраюся ў твары сустрэчных, адказваю ўсмешкай на зычлівыя ўсмешкі незнаёмых людзей. Мне падалося, што нарвегі падобны да славян. Нашчадкі вікінгаў, зразумела, высокага росту. Жанчыны трапляюцца з ільнянымі, плацінавага адцення валасамі. Дзеці з доўгімі бялявымі кудзёркамі ўвогуле выглядаюць анёлкамі. У параўнанні з еўрапейцамі тут меншая разнастайнасць па росце, камплекцыі і «масці». Часта можна бачыць бацькоў з дарослымі дзецьмі, якія кудысь ідуць або едуць, пры гэтым узнікае адчуванне іх еднасці, цеснага і цёплага душэўнага кантакту.

Кідаюцца ў вочы старыя людзі, якія з суправаджэннем альбо самастойна перасоўваюцца ў самаходных калясках. На выбарчы ўчастак у Ставангеры, дзе папярэдняе галасаванне пачынаецца за месяц, першымі прыйшлі мясцовыя сухенькія пенсіянеры. Стэндаў яны не вывучалі: кожны ўжо вызначыўся, каму аддаць свой голас. Мы спыталі пра назіральнікаў. Аказалася, што нікога з прэтэндэнтаў на заканадаўчую ўладу не хвалюе, хто там увайшоў у выбарчую камісію. Назіранне па сутнасці фармальнасць, патасоўкі там немагчымы ў прынцыпе. У наступным годзе будзе адзначацца юбілей — двухсотгоддзе нарвежскага парламента. «Слабы пол» дапусцілі да галасавання ў 1907 годзе, а праз чатыры гады ў парламент была абрана першая жанчына. За столькі гадоў напрацавана пэўная палітычная культура, у параўнанні з якой няпісаныя правілы правядзення выбараў у Беларусі выглядаюць дзікасцю і перажыткам мінулага.

Увогуле, нам давялося шмат супастаўляць і параўноўваць. І параўнанні, на жаль, былі не на карысць нашай дзяржавы…

ВЕРШЫ

ПТУШКІ БЕЗ НЕБА

Леанід ГАЛУБОВІЧ



***

Майсея на рэчцы ў кашолцы знайшлі,
Ісуса ж — у яслях, травою напханых…
Божа, яшчэ нам каго Ты пашлі,
пакінь у разораным радзе бульбяным.

Мы ўсе сцераглі тут і ўдзень і ўначы
Слова Тваё праз Майсея й Ісуса,
аднак жа Твой Дух не змаглі зберагчы —
і ў пройме душы цяпер змрочна і пуста.

Мы тут парадніліі зло і дабро,
казанні пракракаў і пракурораў.
Белае з чорным змяшалі. Таўро
шэрасці гіблай — над нашай прасторай…

Божа, пашлі нам нарэшце таго,
хто не дапусціць душы ўкрыжавання,
а, назапасіўшы Духу Твайго,
верне жывым чалавечае званне.

Чым за габрэяў мы горшы народ —
змучаны, збіты, нямы, распластаны?!
Божа, пашлі яго ў гіблы наш род,
хай ён у полі бульбяным паўстане.

***

Калі б мяне вы ведалі дазвання
і калі б вас дазвання ведаў я, —
то мы не мелі б на зямлі адхлання,
былі б клубком гідлівым гадаўя.

Мне скажуць: пра сябе ты думаць можаш,
што хочаш, а пра іншых — памаўчы;
вялікі досвед толькі смутак множыць,
ад выраку ж зямнога не ўцячы.

Прашу вас не палохацца дарэмна,
бо тых заган не ўведае ніхто,
якіх мы і на споведзі таемнай
дарэшты не адкрыем нізашто.

Але жыццё яны вядуць да скону
і выявяцца ўсе ў апошні час,
хоць і не мы адкрыем іх заслону, —
яны адкрыюць перад Богам нас.

***

Запахла зялёнай крывёю травы…
І бензакасільшчык дастаў
цыгарэту.
Ну, колькі, пытаю ў яго, —
гавары! —
скасіў ты жывога цвітучага
свету?!
Ён пашпарт тэхнічны з кішэні
дастаў
і з ЖЭСам дамову ў падцёках
саляркі…
І больш анічога ў адказ не сказаў,
абдаўшы чарнільным душком
пралетарскім…

Касілка стальная дымела й раўла,
пакуль запацелае сонца не села, —
і там, дзе шумела жывая трава,
пад небам ляжала знямелае сена…

Я розумам ведаю і лад і намер
прыроды зямной і прагрэс
чалавечы,
а дух мяне ўсё-такі ўзносіў наверх,
дзе прагла злучыцца часовае
з вечным…

Туды, дзе трава зелянее штодня,
і ў ёй той касільшчык цвіце,
цверазее,
дзе Госпад касуе ўсе нашыя Я,
і семя адзінства нятленнае сее…

***

Я жыць не наперад спрабую,
— назад.
Не важна, што будзе, а — што засталося…
Ужо састарэў мной пасаджаны сад
і ўсё, што ў ім спела, здзічэла й звялося.

Не надта цікавіць тэхнічны прагрэс,
ні рэтра-майстры, ані новыя песні.
Маленства майго спілавалі ўжо лес,
бабуль і бацькоў на пагорак аднеслі…

За дзень учарашні аддаў бы ўсе дні,
наканаваныя мне ў гэтым свеце.
О Божа, хоць Ты гэты час павярні
чалом да жыцця, а не страхам да смерці...

Нішто не вяртаецца зноўку назад
з таго, што сыходзіла нават ад Бога…
І толькі ўва мне ажывае мой сад,
і лес, і бацькі, і ўсе згадкі былога…

***

Не помню радасці вялікай,
як і бяды, каб скрозь гняла,
бо Той, хто жыць мяне паклікаў,
не аддзяліў дабро ад зла…

Ён настаўляў і сарамоціў,
і выпрабоўваў, і скараў,
я ж, па прымусу ці ахвоце,
як забароненае, краў
жыцця наспеласць і прынаднасць,
не ўсведамляючы таго,
што не жыву Яму на радасць,
а прагну кары ад Яго…

Не проста кары за учынак,
а — справядлівасці за ўсё,
што я займеў тут грэшным чынам,
каб апраўдаць сваё жыццё…

***

Столькі звілістых сцежак
у гэтым лесе,
нібы карункаў на начной кашулі
каханай…

А грунтавая дарога
да патрэбнага месца —
адна.

Навошта ж тады пратаптана
столькі сцежак?

Каб кожны мог адчуць
асалоду ўласнага шляху…

У маміным часе

У спусцелай хаце бацькоўскай
начую.
Пакуль заснуў —
з былымі гаспадарамі
пагаманіў, пасамоціўся…
Гэта ж колькі не бачыліся?!
А ранкам,
нібы ў юнацтве,
з ложка ўсхапіўся
на звон даёнкі —
мама! —
зноў апярэдзіла
мяне і сонца…
Выскачыў на ганак настылы —
няма яе ні ў хляве, ні ў двары…
У вушах толькі звон далёкі
яе даёнкі…
Толькі — звон…
Але ж я не сплю
і гэта не сон…
Во, і ног сляды
на зарошанай сцежцы,
але — куды?!
Не паспяваю за маміным часам —
праспаў яго,
як заўжды,
й гэтым разам…

Паміж зямлёй і небам

Выгульваючы сабаку
ў лясной зоне Зялёнага Лугу,
стаў заўважаць,
што вакол пратаптанай
людзьмі сцяжыны
снуюць шэрыя курчастыя птушкі:
яны ўспырхваюць амаль з-пад ног,
і зноў садзяцца непадалёк…

Я не ведаю,
як іх называюць,
толькі памятаю,
што ў дзяцінстве
мы вылоўлівалі такіх у старых пнях
наўзбоч лясное дарогі,
дзе яны гняздавалі…

Птушкі, што страцілі неба,
не прыжыўшыся на зямлі…

Калі я ўсё ж паэт,
то чаму так падобны да іх?!

На Радаўніцу

Я куплю на вакзале,
дзесь нарваных у лесе,
два букеты канвалій
на магілы Алесям.

З'езджу да Асташонка,
побач — да Пісьмянкова
(там Алесева жонка —
цень яго — і нікога)…

Госпадзе наш Ісусе,
дай іх вольнаму духу
ў небе над Беларуссю
сум развейваць і скруху.

Каб і проза Алеся,
як і вершы Алеся,
бы канваліі ў лесе,
не сканалі ў аскезе.

Мне, нямеючы словам,
горка й цяжка маральна
чарку за Пісьмянкова
піць з вадой мінеральнай,
як і за Асташонка…


Тут, каля іх магілаў,
помніць мая пячонка
ўсё, што душа забыла…

2011–2013 гг.

ФРЭСКА

КАМАРЫК

Барыс ПЯТРОВІЧ



Фота М. Сёдэрберг

1.

…некаторыя камары жывуць і паміраюць, так і не пакаштаваўшы смаку крыві…

я не разгубіўся — злавіў гэтую думку, як матылька ў сачок, і яна адразу ж забілася ў непакоі: а ці праўда гэта?

я спыніўся: ці можа такое быць?

бо мы прывыклі лічыць камароў крывасмокамі… усіх

бо ідэальнай з пункту гледжання, скажам, жыхара камарынага краю беларуса-палешука, павінна быць іншая, адваротная выснова: ніводзін камар не памірае, не выпіўшы хоць бы кроплі крыві… бо тым самым ён выканае сваё прызначэнне, сваё наканаванне, бо іначай — навошта ён прыходзіў у гэты свет?

адказ знайшоўся адразу: праўда… можа! можа такое быць: кроў п'юць толькі самкі, а бедныя самцы нават і не думаюць піць чужую кроў, бо харчуюцца сокам раслінаў… і так і паміраюць, выканаўшы хіба адно сваё прызначэнне, асноўнае: працягнуць род

і зноў жа — не ўсе…

няшчасныя істоты?

а можа, наадварот — шчаслівыя

бо нікога: ні чалавека, ні жывёлу не зачапілі сваёй прысутнасцю на гэтым свеце, нікому не тое што болю не прычынілі, а нават «не сапсавалі настрой»…

і падумалася, як працяг, іншае: а ці ёсць людзі, якія паміраюць, не забіўшы ніводнага камара…

так: не забіўшы нікога — нават камара

не растаптаўшы мураша ці нейкую іншую казюрку

не саграшыўшы…

няўжо знойдзецца той, хто пагодзіцца з гэтым? памятаеце: хто не грэшны, хай першы кіне ў мяне камень…

ці можна пражыць на зямлі (так і хочацца сказаць — на гэтай грэшнай зямлі), не прычыніўшы зла нікому і ніколі?

зноў жа — не саграшыўшы?

я чую ў маўчанні, што вібруе ў цішыні навакольнай, адказ: не, немагчыма…

можна хіба толькі не нарадзіўшыся

але ж і гэта таксама камусьці грэх…

2.

значыць, мы нараджаемся, каб грашыць…

ад першага крыку да апошняга выдыху нас суправаджаюць грахі нашыя

што больш грэх: забіць чалавека, забіць котку ці забіць мураша?

не — гэта страшна, лепш скажу так: што большы грэх — пакрыўдзіць чалавека, пакрыўдзіць котку ці пакрыўдзіць мураша?

але — ці можа ўвогуле грэх быць большым альбо меншым?

не ў сэнсе велічыні, памераў пакрыўджанага (забітага) альбо самой крыўды, а —

ці ёсць розьніца: забіць наўмысна, з асаладай усведамлення таго, альбо зусім не жадаючы — растаптаць мураша між іншым, у кідку радасці да знойдзенага баравічка: мураш таксама некуды спяшаў, таксама жыў нейкаю надзеяй, поўз у гэтым лесе з пэўнаю мэтай, а ты яго растаптаў і не заўважыў нават…

вынік то адзін: забойства

зноў маўчанне: не чую ні слова, відаць, занадта дробную праблему закрануў — усяго толькі праблему жыцця і смерці

…жыцця і смерці…

для камара ты — крыніца жыцця, дык дай яму напіцца тваёй крыві, зрабі ласку, зрабі дабро, пацярпі, перацярпі — ад цябе ж не ўбудзе — і адпусці яго… а ты — хлоп! і забіў… навошта? і кроў твая размазалася клейка па руцэ, нікому непатрэбная цяпер…

ты думаў забіць камара на шчацэ, а даў сам сабе поўху

дык як жыць, каб не грашыць? нават выпадкова…

каб толькі рабіць дабро — міжволі і наўмысна

не ведаю…

я жыву сярод людзей і заўважаю, што найчасцей за маё дабро яны плоцяць злом: ты добры, значыць, ты слабейшы;

значыць, цябе можна падмануць, ударыць, пакрыўдзіць: можна сесці табе на галаву…

такая вось аддзяка ад людзей

і ці адзін я — грэшны! — так думаю?

Мажліва, якраз яно, павярхнёвае, і ёсць тою самаю праўдаю праўд, якую не трэба шукаць далёка, якая заўсёды побач, заўжды з намі...

мажліва, я памыляюся — я хачу верыць, што памыляюся, я сябе пераконваю, што памыляюся: людзі добрыя і спагадлівыя, толькі не ўсе яны ведаюць пра гэта…

3.

пачынаецца ўсё з расціснутага камарыка ці мураша, а заканчваецца вайной між дзяржавамі, на якой гінуць спачатку тысячы, а потым мільёны не камарыкаў, не мурашоў (іх увогуле ніхто не лічыць, калі падаюць бомбы) — людзей

беспакаранасць у маленькім граху спараджае надзею на беспакаранасць у вялікім: калі можна забіць аднаго камарыка, значыць, можна забіць і тысячы

чалавека можна забіць за тое, што ён — вораг (іншадумец, іншаверац, чужаземец…)

ніводная рэлігія не аспрэчвае гэта: зло павінна быць пакарана, а што вораг — зло, не сумняваецца ніхто, і словы пра падстаўленую другую шчаку забываюцца імгненна, калі гэта тычыцца не сябра, а во-ра-га

хто для яго «вораг», вызначае той, хто забівае — і ў гэтым першая несправядлівасць

і спакуса:

калі можна назваць ворагам і забіць аднаго чалавека, значыць, можна забіць мільёны

ворагаў — гэта значыць: іншаверцаў, іншапляменцаў

ці проста тых, хто перашкаджае табе ісці да прыдуманай табою мэты (да шчасця тых, хто пакуль не разумее, што ты іх вядзеш да шчасця), незалежна ад іх колеру скуры і веры, незалежна ад таго, жывуць яны на бліжнім востраве, у памежнай краіне ці ў суседнім доме, у суседскай кватэры…

і калі Бог не карае забойцу за тысячы (мільёны) знішчаных па дарозе прыдуманага ім шчасця, а дазваляе дажыць да васмідзесяці, да ста гадоў, значыць, ён усё рабіў правільна, значыць, ён дагадзіў Яму — так, відаць, думае забойца і жыве ў цялесным спакоі…

ніхто не ведае, што думае Бог і чаму ён дае мажлівасць ка´ту памерці сваёй смерцю — чаму дазваляе тырану, які пусціў рэкі чалавечай крыві ў акіяны слёз, дажыць да спачувальнай старасці

што яго, забойцу мільёнаў, чакае там, куды ён, урэшце, пойдзе? калі ён прыйдзе туды, куды адправіў па дарозе да ўяўнага шчасця (а аказалася — толькі дзеля захавання сваёй улады і ўласнай скуры…) мільёны суайчыннікаў і нічыіх ворагаў?

мы не ведаем, колькі б нас ні палохалі пеклам

ён сам не ведае таго — і толькі ў гэтым ягоны спакой тут…

4.

камар можа пражыць сваё камарынае жыццё, не саграшыўшы: так і не выпіўшы ні кроплі крыві (зрэшты, зноў пытанне: хіба можна лічыць грахом тое, што накавана табе ад прыроды, тое, што ўласна і падтрымлівае тваю душу ў целе?)

камар можа… пэўна ж, можа пражыць — насуперак сваёй прыродзе, можа, калі народзіцца не ў горадзе сярод людзей і не паблізу вёскі, а ў далёкай бязлюднай і безжывёльнай тундры

мураш можа пражыць без граху

дык а чаму ж тады чалавек не можа?

пачакайце, не пераконвайце: не веру, што не можа

бо мы й з'явіліся тут, на гэтай планеце, каб навучыцца ўрэшце рэшт жыць і не грашыць

думаю: канец свету прыйдзе менавіта тады, калі чалавек — усе чалавекі! — зможа жыць, не грашыўшы

у добрым сэнсе — канец свету

бо гэта будзе не канец, як мы яго разумеем, — а пачатак чагосьці новага, абсалютна новага —

магчыма якраз таго, што ўласна і называецца жыццём

5.

не думаў, зусім не думаў, пачынаючы пісаць, што мяне панясе ў псеўдафіласофію —

у агульначалавечае, так бы мовіць (ці агульнакамарынае…)

хацеў скласці просценькі тэкстік з некалькіх сказаў, асновай якога была «прыгожая» думка, што ёсць на свеце камары, якія паміраюць, так і не пакаштаваўшы смаку крыві… (і тым самым нібыта не выканаўшы сваё прызначэнне ў нашым разуменні іх як крывапіўцаў)

а атрымалася чарговая банальшчына пра людзей… (а ў чым, уласна, прызначэнне людзей на зямлі? няўжо, каб выжываць, забіваючы? няўжо, каб перамагаць, знішчаючы? няўжо, каб грашыць дзеля… ды няважна чаго дзеля…)

але хто сказаў, што банальнае і павярхнёвае не можа быць ісцінай? (бо менавіта самае простае ўбачыць найцяжэй, і, як паказвае гісторыя, найчасцей яно бывае самым дакладным і правільным)

мажліва, якраз яно, павярхнёвае, і ёсць тою самаю праўдаю праўд, якую не трэба шукаць далёка, якая заўсёды побач, заўжды з намі...

так — пакуль нараджаюцца і лятуць да нас камары, пакуль паўзуць некуды па сваіх справах мурашы, пакуль не перавяліся на зямлі грэшнікі, пакуль зямля круціцца…

«пакуль зямля яшчэ круціцца»…

у кожнага з нас ёсць шанец спыніцца і задумацца:

чаму, дзеля чаго я (ты, ён, яна, мы…) з'явіўся на гэты свет?

і прыйсці да высновы:

мо якраз дзеля таго, каб не забіць, а напаіць сваёю крывёй хоць бы аднаго камара…

і тым выканаць сваё прызначэнне

6.

дык ці ёсць на свеце камары, якія так і паміраюць, не пакаштаваўшы смаку крыві?

любы, трохі дасведчаны, чалавек адкажа вам адназначна: вядома ёсць… і параіць, калі вы яшчэ гэтага не зрабілі, набраць у інтэрнэце слова «камар», каб даведацца ўсё пра гэтых малых смактуноў

і тады пацвердзіцца, што кроў п'юць толькі самкі, а бедныя самцы нават і не думаюць піць чужую кроў, бо харчуюцца сокам раслінаў…

і тады апынецца, што ёсць на зямлі благаславенныя мясціны — рай для людзей, дзе (цяжка паверыць) увогуле няма камароў: астравы Новай Зеландыі

аднак, не ўсё гэтак бяскрыўдна, як можна падумаць

на Каўказе, ад аднаго грузіна, я пачуў міф пра беларускіх партызанаў, якія прыдумалі найжорсткае пакаранне для фашыстаў і здраднікаў: пакідалі іх на ноч голых і звязаных каля балота: камары высмоктвалі да раніцы з іх усю кроў, і яны паміралі пакутніцкай смерцю…

тут, на Беларусі, я нічога такога не чуў, праўда, некалі чытаў у нейкай кнізе, што такое рабілі японскія захопнікі-самураі ў Кітаі ды на Халкін-Голе

і тады высветліцца, што ад укусаў камароў, ад бяскрыўдных камароў, памірае ў свеце больш людзей, чым ад СНІДу, раку, іншых хваробаў, чым у аўта- і авіяаварыях, чым цяпер на войнах, што раз-пораз недзе адбываюцца, бо камары пераносяць невылечныя захворванні і надзяляюць імі ўкушаных людзей…

не ўсё так проста, аказваецца, на гэтым свеце

але — і не ўсё так прыкра

фільм «Парк юрскага перыяду», памятаеце, заснаваны на тым, што дыназаўраў кланавалі з кропелькі крыві, якая захавалася ў камары, «мумізаваным» у бурштыне

а таму — падумайце, перш чым забіць камара, які вырашыў падхарчавацца вамі, магчыма, прызначэнне камароў у тым, каб уратаваць чалавецтва ад знікн…

зрэшты, рабіце высновы самі

7.

кропка — тэкст на гэтым скончаўся…

але

мяне затрымала і не адпускала слова «камар», бо я згадаў раптам, што вулічная мянушка нашага роду ў вёсцы была (і ёсць) Камаровы

у палескіх сёлах, дзе часта на некалькі сотняў, а то і тысячаў, жыхароў усяго два-тры (чатырыпяць) асноўных прозвішчаў — такое звычайная рэч, каб адрозніць усіх цёзак Пятроў Іванавічаў ды Сяргееў Уладзіміравічаў

у вёсцы гэта спрацоўвала, а калі, да прыкладу, маім аднакласнікам Дземідзенкам Віктарам Міхайлавічам, якіх у школе адрознівалі якраз па клічках, давялося ехаць у ваенкамат, то там вымушаныя былі іх называць аднаго сынам Марыі, другога сынам Наталлі, а трэцяга сынам Тамары…

пашанцавала: у іхніх маці былі розныя імёны

у маім класе Сачанак было шасцёра — і ўсе не радня, бо карані сваяцтва — якое, безумоўна, было — згубіліся недзе ў мінулым, але, дзякуй Богу, ва ўсіх нас былі розныя імёны, і таму нас не блыталі

дык вось, мянушка нашая вясковая была Камаровы, і адпаведна бацька мой быў Пятро Камароў, я — Барыс Пятра Камаровага, а мама — Маня Пятра Камаровага

дарэчы, недзе напрыканцы пазамінулага стагоддзя ў вёсцы з'явілася і афіцыйнае прозвішча Камароў — п'яны бацюшка, вянчаючы брата майго прадзеда, спытаўся, як яго завуць — і ён адказаў па-вулічнаму: Алесь Камароў; бацюшка так і запісаў яго ў сваёй кнізе, і цяпер мае стрыечныя браты па мужчынскай лініі (па мячы) не Сачанкі, а Камаровы

(камар і сачок на пачатку тэксту — аказваецца, невыпадковае спалучэнне…)

найважнейшае слова тут — у гэтым дадатку — Камароў, ці — Камар, як часцей скарочана называлі кожнага з нас паасобку — бацьку ці мяне, іншых з нашае радні, і была гэтая мянушка крыўднай-крыўднай, і не адзін абазваны так Камар біўся ў кроў з нейкім Шундзікам ці Лапласам (таксама вясковыя мянушкі — Кашперкаў ды Іваноценкаў), хоць, здавалася б, нічога крыўднага ў ёй, гэтай мянушцы, няма…

8.

а цяпер, каб канчаткова заблытацца, перачытайце ўвесь гэты тэкст са словам камар з вялікай літары.

кропка

САНЭТЫ

ЗНАКІ ЗАДЫЯКА

Фёдар ЯСТРАБ



* * *

Вятры вякоў сівых, як лістагоны,
Штось замятуць да зімаў, кінуць ніц,
А дзесь аголяць праўду таямніц,
І зашумяць пагрозлівыя кроны.

Нічога вечнага — і нават троны
Скідаюць седакоў у тло цямніц;
Усіх час выбіў са сваіх байніц —
Не зратавалі скарбы і кароны.

Мільярды душ, прайшоўшых па зямлі,
Зрабіўшы штосьці, у зе лягглі…
Каго з іх памяць наша зберагла?

Было заўжды пад неба сутарэннем:
Даруе Час іскрыстае імгненне —
Была пустэча, будзе зноў імгла…

* * *

Ночы, як знічкі, і дні-скараходы
Прамільгацяць і губляюцца дзесьці,
Быццам з мінулага цьмяныя весці:
Аэрапланы, аўто, параходы,

Модныя дамы, мужчынскія кепкі,
Тлумны натоўп увесь дзень на вакзале —
Час неадступнае сальта-мартале
Жудасна круціць, шугаюць аскепкі

Жыццяў далёкіх, усімі забытых,
Бедных, багатых, важных, нікчэмных,
Схімнікаў, злодзеяў і каралёў…

Колькі іх там, у магілах зарытых,
Хіба іх шлях быў настолькі дарэмны?
Хіба падзяка — грудок між палёў?

* * *

Калі цябе адольвае маркота,
Яе, як злую фею, прагані
І запалі тры свечкі, тры агні,
І хай агнём напоўніцца істота.

Агонь атуліць, напаўзе дрымота,
І ўбачыш сон: ты на гнядым кані
Ляціш туды, дзе сонца прамяні
Цябе аблашчаць, агарнуць пяшчотай…

Ах, сон — збавенне ад зямных турбот
І невыказнай лёгкасці палёт,
І вобразаў размытых дух сакральны!

А можа і не сон, а іншы свет,
Ён побач, ды яго не знойдзеш след,
І можа, гэты свет — такі ж рэальны?!

* * *

Бывае нейкім днём, калі турботы,
Нібыта злыя ў спёку авадні,
Так дапякаюць, хоць з маста сігні…
Няўжо нас Бог стварыў дзеля работы?

Я не ў сябрах адвечнае ляноты,
Але, калі вячэрнія агні
Завуць прывабна — Божа барані,
Да справы быць прыкаваным без ахвоты.

Жыццё — не толькі для работы кут,
І я не конь, каб надзяваць хамут:
Ёсць для работы час, а ёсць — для свята.

Жыццё адно — я два не пражыву.
Калі мне Бог назначыць рандэву,
То не хачу прад ім стаяць гарбатым!

* * *

Душой не стану спакваля крывіць,
Бо не хачу духоўнае растраты,
І так, напэўна, гэты час пракляты…
Яго пакуты як нам пераджыць?

І сэрца рванае за ўсіх баліць —
Да часу гэтага Хрыстос распяты.
А новы век… Ён запісаўся ў каты,
Згубіўшы дзесьці Арыядны ніць.

Гартаеш лёсаў жоўклыя старонкі,
На іх нажывы дух крывава-звонкі…
Я думаю, што гэта й нам прысуд.

Гібее Вера, і заўсёдна рады,
Хто сее зерне нечаканай здрады,
І падрастае дзесьці новы Брут.

* * *

Над галавой тваёю — знакі Задыяка…
Плёў сетку зорную мільярды год павук,
Каб метак-зорак лёсаносны перагук
Накрэсліў шлях твой рысаю
сакральнай знака.

То не карцінка дзіўная пад слоем лака,
Не штосьці раз і назаўсёды — быццам з рук
Даюцца варыянты. Не пазбегнуць мук,
Калі не зробіш выбар. Выбар — ёсць адзнака.

Ты скажаш: «Што за глупства,
выпадковасць гэта!
Мы самі па сабе. Прычым дыктат Сусвету?
Яму якія, зрэшты, справы да мяне?»

Як быццам бы і праўда: ты —
фантом, імгненне,
Але табой калісьці кінутае зерне
Узыдзе і ў Сусвеце нешта закране!

СЯБРЫНА

СВЕТЛАСЦЬ СЛОЎ

Аляксій КАНАНЕНКА

* * *

Мая памяць жыве ад мяне асобна.
Мая памяць — іншакшы чыннік.
На ёй — старэнькі мой плашч зялёны,
Мае чаравікі і мой гадзіннік.

На ўсё астатняе я забыўся,
А вось гадзіннік мой — неаспрэчна,
Ён у мінулым гэдзе спыніўся,
Я вырашыў, што навечна.

Аж бачу, памяць па ім звярае
Мае секунды, мае гадзіны,
Мае надзеі, сумоты, страты,
Мае здабыткі, мае правіны.

Чаму ж блукае па свеце памяць?
Чаму мы з ёю ніяк не разам?
Маю цыгарку нахабна паліць,
Мой час пільнуе… З якога часу?

Знайду нябогу, схаплюся ўпарта:
— Вось і сышліся! Бо ўсё сышлося!
Мо, годзе бегаць? Хадзем дахаты!
Прашэпча памяць:
— Пайшлі — у Восень…

* * *

Я ўпаў у снег.
А воўча зграя
Хрыпіць
За міг якісь
Ад майго цела — ласы падвячорак…
Я — мяса.
Не адпрэчыць вечны боль.
Боль першасны,
Пякельны боль,
Пячорны.
Я прыпыніў шалёны бег.
Упаў у снег…
Чаго хацеў?
Чакаў якой хвіліны я?
Не ведаю.
Ваўкі сягодня будуць сытыя.
Надоўга?
Ячэ трымцела
Гарачае цела…
Сагрэты,
Раставаў паволі снег…
Набегла зграя…

Галіна ТАРАСЮК

На Сёмуху дождж

Алаізію Вальдану

Хтосьці збіраўся ў царкву,
ды не мае грошай на свечку,
вось і глядзіць у вакно
на сумна-зялёны дождж,
густы і ціхі, як трава ў садзе,
і баіцца прызнацца Богу,
што і на хлеб няма.
З варот насупраць,
падмінаючы дождж,
выпаўзае шыкоўнае аўто.
«Бог яго любіць», — думае той,
хто на свечку не мае,
пра таго,
хто ў чорным лімузіне.
Нядзеля, Сёмуха. Дождж.

* * *

Воля Твая бязмежная
і мілата Твая
у небе самотна мерзне
крык жураўля

у небе самотным небе
колькі самоты тут
маланак чорныя сцяблінны
дзікай сінню цвітуць

даўка й дрыготка льецца
з вечнасці светласць слоў.
Божа, гэта завецца
спаміж людзей любоў

Жаночая логіка

Чалавецтва жыве па законах
Мужчынскай логікі.
Прырода — па законах жаночай.
Таму яна не ведае,
Што такое безвыходнасць.
Безвыходнасць перад смерцю.

Алеся САНДЫГА

Людміла

Людзям мілай была,
як магла, так жыла, існавала.
Ці снавала над сонцам, заснула і
і раптам за вокнамі ноч.

і стаіць, як пустая, забытая хата,
на яе белых сценах
курчавы хлапчыска-вандал,
купідончык, ісусік ці, можа,
маленькі Валодзя Ульянаў і
хто разгледзіць у прыцемку і
напісаў, што ты, Людка, дурніца,
а тады ў сініх шыбах
выбіў каменем чорныя зрэнкі-прагалы.

Людзям мілай была, як магла,
так жыла, існавала,
Ці снавала пад сонцам, заснула і
аж раптам за вокнамі ноч.

І ляжыць, быццам дрэва паміж берагамі,
і паўзуць праз яе мностквы шэрых гадзюк.
Ах, Афелія, то ж над табою
серабрыста стракозкі дрыжаць, і трымціць
машката, быццам хмарка,
і плывуць у смузе павуцінкі,
а вярба ці аплаквае гора твае,
ці зласліва плюе табе проста ў зшарэлы
і зморшчаны твар.

Людзям мілай была, як магла, так жыла,
існавала,
ці снавала пад сонцам, заснула і
аж раптам за вокнамі ноч.

І вісіць, як ануча, на прызбе забытая,
а наўкол стракаціць
свет гламурных старонак,
шакаладных абгортак,
шаргаціцца, прыніжаны, кінуты,
ветрам аднесены,
шчэ нядаўна жаданы, асыпаны золатам
свет,
дзе так пляскалі ў ладкі аголеным
і хударлявым,
залатыя расставіўшы пальчыкі,
і барвяныя ў прожылках пяцярні,
і далонькі брунатныя...
Мы збуцвеем, яны расцвітуць, пачакаўшы.
Толькі ты, о ануча з нейлону.
Людзям мілай была, як магла,
так жыла, існавала,
ці снавала пад сонцам, заснула і
аж раптам за вокнамі ноч.

Цела жоўтае, гладкае як серыяльнага
мача Хуана
ценем Дона Хуана раптоўна накрыла,
і зноў
ты стаіш, хата белая,
ляжыш, дрэва шэрае,
вісіш пашарпанаю чорнай анучай,
адны бессаромна і гола тырчаць
ступакі,
нязграбна абцёсаны Сынам Грааль,
у якім аціхае душа,
а знадворку шкрабецца
вострым кіпцікам Бог.

...Раба без імя, на бязлюддзі, нямілая,
ці змагла, ці адолела, ці жыла-існавала і
ці снавала пад сонцам, заснула і
прачніся! За вокнамі ноч.

Лічылка

Раз — мокры сабака,
Два — мокры сабака.
Два мокрыя сабакі гойсаюць
між крыжамі,
лашчацца, выпрошваюць пачастунак,
а вочы ў іх карыя — як у мяне.

Тры — чорныя вароны,
чатыры — чорныя вароны.
Чатыры вароны зладзілі над мокрымі
могілкамі
у паралельным вымярэнні
шумную вечарынку.

Пяць — жанчын у чорным,
шэсць — жанчын у чорным,
стогнуць жанчыны ў чорным
па ўсіх магілках,
нібы просяцца ў неба, да таварышак.

Сем — белых вяргіняў,
восем — белых вяргіняў,
як гірлянды згаслых галагенавых
лямпачак.
Госпадзі, думае цвінтар,
калі ў іх скончацца нарэшце
гэтыя белыя вяргініі?
Дзевяць — свежых магіл.
Дзесяць — свежых магіл —
не ўпасці б.
Расце-расце цвінтар хутка,
як чужое немаўля.

Пераклад з украінскай Людмілы Рублеўскай

ЗГАДКІ

ПАМЯЦЬ ПРА РАДАСЦЬ

Алесь ЖУК

З Міхасём Стральцовым пазнаёміўся яшчэ школьнікам, калі пасля першае свае публікацыі ў «Нёмане» прывёз апавяданні ў «Маладосць». Стральцоў спадабаўся мне нечаканай ціхай усмешлівасцю і быццам сарамлівасцю, усё роўна як гэта ён, а не я прыйшоў са сваімі спробамі.



Назіраў, як яго рука з алоўкам не адрывалася ад напісанага мной, акуратна, як школьнае сачыненне. Чытаў ён і курыў цыгарэту, тоненька віўся лёгкі дымок, нешта заклапочана перабіраў на сваім стале Мікола Аўрамчык, коратка пазіраючы то на мяне, то на Міхася. І пад той час, як было скончана чытанне, Мікола Якаўлевіч знік з кабінета. Чалавек вопытны, ён ведаў, якая будзе гаворка. Я не надта і запамінаў, што мне гаварыў Міхась Лявонавіч, бо прайшоўся ён і па радках, і па асобных словах. Я здагадваўся пра агульную ацэнку напісанага, бо яно таго і заслугоўвала. Калі стаў студэнтам, працягваў насіць Стральцову напісанае. Ён чытаў, паўтараў памятнае мне з першай сустрэчы: «Разумееш, старычок», «тут нешта не тое, старычок…»

Пасля першае сустрэчы я яшчэ і са школы прысылаў напісанае, бо ён сказаў мне не пакідаць пісаць. З прысланага мной ён адобрыў толькі невялічкую навэлку «Балада». Для друкавання ў часопісе гэтага было мала. Гэтая навэлка спадабалася і Рыгору Бярозкіну, які быў кіраўніком семінара на нарадзе маладых пісьменнікаў на Свіцязі, яна і была надрукавана ў «ЛіМе» як твор удзельніка семінара. Пазней я памяняў назву на «Мужчыны»…

У той час сталі даступнымі чытачу Рэмарк, Фіцджэральд, Хэмінгуэй, барадатыя партрэты якога прадаваліся ў кіёсках «Саюздруку». Захапленне імі не магло не закрануць літаратурных пачаткоўцаў. Але ўсё тое замежнае было недзе далей, бліжэй было сваё, якое літаратуразнаўцы называлі лірычнай прозай, пачатай Янкам Брылём, падхопленае Міхасём Стральцовым, Вячаславам Адамчыкам… «Блакітны вецер» Міхася Стральцова не мог не паланіць тонкай паэтычнасцю, настраёвасцю, мелодыкай фразы, псіхалагічнасцю, дакладнасцю пісьма, увагай да канкрэтнага жывога чалавека. Пасля заідэалагізаванай, груваскай па пісьму, груба канструяванай літаратуры было ап'яненне ад гэтага свежага, новага струменю. Магчыма, цяпер, перачытваючы напісанае амаль усімі з першага і наступных «філалагічных» пакаленняў, можна прыдрацца да самамэтнага любавання словам, захаплення пластыкай фразы, маляўнічасцю і настраёвасцю, але тое не было даганяннем ні Буніна, ні Чэхава. Прыйшоў аб'ектыўны працэс, калі беларуская літаратура павінна была ў сціслы час дараспрацаваць тое, што пачынаў у сваіх ранніх апавяданнях Кузьма Чорны, што закладваў у сваіх творах Максім Гарэцкі, ды і не толькі яны, але і іншыя дачасна загубленыя беларускія пісьменнікі. Няхай і была зададзенасць, але здабыткі напісанага «філалагічнымі» пакаленнямі маюць мастацкую вартасць. А што датычыць Міхася Стральцова, то ім напішуцца хрэстаматыйныя творы, што відавочна ўжо сёння.

Першае апавяданне Міхась Стральцоў надрукаваў у 1957 годзе, кніга апавяданняў «Блакітны вецер» выйшла ў 1962-м. Адразу была заўважана і чытачом, і крытыкай, стала з'явай у беларускай літаратуры, бо вельмі асвяжальны і патрэбны быў гэты блакітны вецер. Адрэагавала на кнігу Стральцова і артадаксальная крытыка, вядома ж — адмоўна. Наступная кніга прозы Міхася Стральцова «Сена на асфальце» выйшла ў 1966 годзе.

Хацця першае апавяданне было пазначана 1957-м, усе пазнейшыя кнігі: «Сена на асфальце», выбранае ў «Бібліятэцы беларускай прозы», «Выбранае» 1987 года (як даўно не перавыдаваўся Стральцоў!) будуць пачынацца «Трыпціхам», цыклам з трох невялічкіх апавяданняў. Першае мае назву «Трывожна крычыць птушка». Стральцоў невыпадкова на першае месца ставіць пазнейшае па часе напісання. Ужо першы зборнік Міхася Стральцова адметны тонкай стылістычнасцю, пазначаны творчай індывідуальнасцю. У «Трывожна крычыць птушка» чалавек, істота далёка не вечная на зямлі, пададзены сам-насам з вечнаю прыродаю, яе прыгажосцю. У ім неспадзявана ўзнікае разуменне гэтай кароткасці чалавечага жыцця на зямлі, і гэтае разуменне абуджае ў ім падсвядомую трывогу за драматычнасць кароткасці чалавечага жыцця. І вось гэтае адчуванне стварае своеасаблівы стральцоўскі настрой. Гэтым настроем будзе падсвядома няўлоўна падсвечана ўсё напісанае Міхасём Стральцовым: і ў прозе, і ў паэзіі, і «Загадка Багдановіча».

Сама назва кнігі «Сена на асфальце» дала назву таму, што адбывалася ў жыцці. Нечакана імкліва пачала адыходзіць у нябыт беларуская вёска, вясковы чалавек рабіўся гарадскім жыхаром, яму трэба было ствараць і асвойваць новы лад жыцця. Чалавек разгубіўся, сёйтой пачаў проста прападаць у новых умовах, астатнія імкліва перараджаліся, дарваўшыся да спажывальніцтва, якое намнога болей даступна ў горадзе, чым у вёсцы. Міхась Стральцоў болей амаль не вяртаўся да гэтае тэмы, ён толькі абазначыў яе, даўшы ёмкую назву новаяўленаму гараджаніну, — «сена на асфальце». А праява гэтая была складаная, адгалоскі яе чуваць яшчэ і дасюль, бо ў выніку атрымалася з людзей не толькі «сена», але і дэнацыялізаваная «пацяруха» ў вялікіх і малых гарадах. Ды і сама вёска, якую былі аб'явілі «неперспектыўнай», не надта паддавалася «абгарадзенню», а калі і засвойвала, но не лепшае з гарадскога ўкладу жыцця, імкліва пачала трацыць стагоддзямі намытыя залацінкі сапраўдных чалавечых каштоўнасцяў, нацыянальнага характару, ды і проста чалавечай годнасці і самапавагі. Ёй і сёння, новай, патрэбен падмурак для станаўлення, падмурак стагоддзямі назапашанага жыццёвага вопыту…

Але тады ў творчасці Міхася Стральцова быў толькі, няхай адразу сталы, але пачатак, яго болей прывабліваў «вечныя» тэмы, тэма загадкі самога творчага пачатку ў чалавеку. Інакш ён не ўзяўся б пісаць «Загадку Багдановіча». «Загадка» будзе пазней. А пакуль што маладосць і сучаснасць брала сваё, ды і тое, што хацелася сказаць у прозе, не было яшчэ сказана. У жыцці ўжо былі не толькі Лагацкія, але і «Светы Іванавічы данжуаны», была і проста маладая радасць жыццю. За «Светаў Іванавічаў» Стральцову перападала больш за ўсё ад крытыкі, пра якую ўжо гаварылася.

Была яшчэ і памяць дзяцінства, самая моцная ў чалавеку. Міхась Стральцоў, як і яго равеснікі, дзіцячымі вачыма бачыў вайну і перажыў пасляваеннчыну. Назва апавядання «На чацвёртым годзе вайны» падсвечана эпіграфам з К. Случэўскага: «И капля вод полна трагедий И неизбежности полна». Герой апавядання нават не мае ўласнага імя, ён проста «малы», ён жыве са старымі, і на ўсіх іх адно гора, гора вайны. А для малога і яго сям'і — пахаронка на бацьку. Апавяданне пранізліва-балючае праўдаю простага чалавека, тым, што робіць яму вайна.

Пазней гэты «малы» атрымае ўласнае імя ў аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь».

Пасляваенная вёска, холадна і голадна, нават няма чаго абуць, каб выйсці з хаты хлопчыку Іванку, якому б найвялікшаю радасцю было пастраляць з рагаткі па вераб'ях. Які маленькі абмежаваны свет Іванкі і яго дзеда Міхалкі! І гэтак апаэтызаваны сумнымі зімовымі краявідамі. Гэта адчуванне і Іванка, і дзед Міхалка. У яго жыццё канчаецца, ён гэта ведае. У другога наперадзе яшчэ многа радасці — цэлае жыццё. Але і на краёчку жыцця дзед Міхалка шкадуе Іванку за яго беднае дзяцінства, з горычу думае, што ў ягоным жыцці ўжо нічога не засталося, акрамя шкадавання. Іванка шкадуе дзеда за тое, што ён ужо зусім старэнькі. Адно жыццё гаротна канчаецца, другое жыццё гаротна пачынаецца. Гэтая аповесць як не адна іншая рэч пранізана шчасцем і трагізмам, паэзіяй чалавечага жыцця. Усё гэта дасягаецца найперш тым жа стральцоўскім настроем. Дакладнасць псіхалогіі, паэтычнасць, бездакорная стылістычнасць тут усяго толькі інструментарый.

Ад'язджаючы з вёскі ў горад, я забыўся дома часопіс «Маладосць» з аповесцю Міхася Стральцова. Калі прыехаў у наступны раз, мама спытала, ці ведаю Стральцова, колькі яму гадоў. Яна прачытала аповесць. Мама пражыла цяжкае сірочае дзяцінства. Ды і пазней за работаю ёй не было калі чытаць. Літаратуру яна ведала толькі тую, якую некалі вучыла ў школе. Ад яе я пачуў і запомніў не толькі Купалавага «Хлопчык і лётчык», але «І лягла цішыня У бары за гарой, Каб дрывінка адна Хоць кіўнула сабой», Коласава «Не сядзіцца ў хаце Хлопчыку малому». А «Савося — распуснік» мама чытала па памяці ўсяго. Калі я сказаў, колькі гадоў Міхасю, паківала галавой: «Якая душа ў чалавека — такі малады, а так пра нас усіх напісаў». Прызналася, што калі чытала, плакала. Часопіс папрасіла пакінуць.

У гэтай аповесці ўжо прагучаў Стральцоў-паэт:

Ноччу бязлюднай і цёмнай,
Іду па зямлі,
Высачэзны і лёгкі,
Пакалыхваючыся ад тугі.
Галава прыгнулася пад небам,
Я плачу.
Зоркі — слёзы мае.
Спяць гарады і вёскі,
Я над імі іду.
Высокі, пахілы і лёгкі,
Пакалыхваючыся ад тугі.
Шукаю шэрую вёску,
Вёску сваю.
Баюся:
Вышэзны і лёгкі,
Не прысяду там на парог,
Як самалёт рэактыўны не сядзе
На травяністым аэрадроме…
Я плачу.
Зоркі — слёзы мае.

«Адзін лапаць, адзін чунь» выйшла ў 1970 годзе. У 1973-м Стральцовым будзе напісана «Смаленне вепрука», пасур'ёзнаму апошняя яго празаічная рэч, і будзе выдадзена кніга паэзіі «Ядлоўцавы куст».

«Смаленне вепрука» нельга раскласці на састаўныя, нельга разабраць, сыходзячы з крытычна-літаратуразнаўчых пастулатаў. Гэтае апавяданне — адно з тых рэдкіх твораў у літаратуры наогул, якое не паддаецца разгляду. Ужо сорак гадоў з часу яго напісання, а яно і сёння найперш і на слыху, і на духу, калі гаворка заходзіць пра Міхася Стральцова. Яно запатрабаванае і сённяшнім маладым ужо чытачом. Яно ў нейкім магічным крыштале скандэнсавала ўсё, што турбавала і цікавіла пісьменніка праз усё літаратурнае жыццё. Апавяданне скрозь паліфанічнае, асацыятыўнае. Канкрэтныя дэталі пераўтвараюцца ў сімвалы, абагульненні, узнікае трохмернасць адчування і разумення, памяці і існасці сённяшняй, пазначаны пункціры ў будучае. Надзвычай багаты інструментарый, але не ён галоўнае і не ён самамэта. Ідзе пераўвасабленне пісьменніка ў аб'ект пісання, у сына, у гаспадара. Героямі апавядання іх назваць ніяк нельга. Пісьменнік адкрыта гаворыць, што намагаецца загнаць у падтэкст напісанае, а на самай справе ён намагаецца вывесці да чытача напісанае. Канструкцыя, выкарыстаныя Стральцовым прыёмы дазваляюць свабодна перамяшчацца ў часе, праецыраваць напісанае на будучае — і ўжо ад яго вяртацца ў сённяшняе. Стылістыка Стральцова мяняецца ад музычнай, пластычнай па ладу фразы да кароткай, у якой пазбягаюцца эпітэты. Нешта такое ў зачатку было ў ранніх апавяданнях Кузьмы Чорнага. Вось апісаны сон, і пасля яго кароценькі абзац:

«Ва ўсіх нас ёсць ці была маці, і, на жаль, не заўсёды добрыя прыходзяць да нас тэлеграмы…»

Жыццё і смерць, драматызм і трагізм чалавечага жыцця ўстае за ўсім гэтым, у самым зачатку жыцця, і няўмольна ідзе следам.

«…І раптам побач, ці не за драўляным плотам, у гародчыку, коратка і жаласна цўкнула птушанё. Гэта як бы нейкі знак быў, і ён спыніўся і паглядзеў туды. Халаднаватая чырвань аблівала бэз, павеў скразнявога ветру, і цені ад яго затрапяталіся на жоўтай сцяне, і зноў прыцішана жаласна цўкнула птушанё. Тады ён прыглядзеўся і ўбачыў яго. Ён бачыў яго блізкае, тое сумнае натапыранае, шэрае птушанё, гэтак бясконца, незразумела адзінокае ў знаёмай яму і, мусіць, не першы раз аблюбаванай засені падвечаровага куста. На сцяне, на вялікіх працягах горада памірала сонца, і што адчуваў, каму і на што жаліўся ён, гэты жывы маленькі камячок, натомлены за дзень нейкім сваім, зразумелым яму, а мо і зусім незразумелым клопатам? Што гэта: страх, натужанае чаканне непасільнага празарэння ці чуйна, вусцішна і раптоўна адасобленасць ад усяго і разлад з усім? І ці не так трывожыць, гняце незразумелым нейкім сэнсам і самога чалавека тужлівая палоска расхінутай на захадзе вечаровай зары?...»

Успомнім тое, на пачатку намі гаворанае «трывожна крычыць птушка», і запомнім гэтую вечаровую чырвань. Яны яшчэ ўзнікнуць.

Пра каго і дзеля каго і чаго гэта напісана? Пра сябе і кожнага з нас?..Наогул пра жыццё?..

У канцы апавядання «Смаленне вепрука» чытаем: «Наіўны, ён хоча перамагчы сапраўднасць, ён хоча верыць: я засцярогся ад бяды — бо сказаў. Дабро і надзея тут накрэслілі свой круг». Не дапамаглі ад бяды ні засцярога, ні круг надзеі і дабра, ды і круг — дзеянне закончанае…

Пісаць пастаянна ў такім напружанні, як напісана «Смаленне вепрука», нельга, такога напружання і самаадданы вытрымаць доўга немагчыма, але і па-ранейшаму пісаць ужо немагчыма нават на адным узроўні. Пра гэта дакладна сказала Бэла Ахмадуліна: «Писать, как хочу, не умею, Писать, как умею, — зачем?»

У прадмове да «Выбранага» Міхася Стральцова Алесь Адамовіч справядліва напісаў: «У літаратуры так: нават усе разам і нават выдатныя не могуць замяніць аднаго — калі гэта сапраўдны талент». І яшчэ Алесем Адамовічам было сказана: «Я, напрыклад, упэўнены, што сярод таго лепшага, што будзе выразней заўважацца заўтра, хрэстаматыйна загучаць назвы такіх твораў: «На чацвёртым годзе вайны», «Адзін лапаць, адзін чунь», «Смаленне вепрука», «Загадка Багдановіча»… Сказана прароча. Адамовічу хацелася і ён спадзяваўся, што Стральцоў вернецца ў прозу. Ён не вярнуўся. Хутчэй таму, што паліфанічнасць, асацыятыўнасць, шматмернасць, свабоднае перамяшчэнне ў часе паштодзённы інструментарый паэта. Проза патрабуе пэўных абавязковых атрыбутаў, якія я называю «радамі», якія мусіш пісаць. Але, можа, Стральцоў і вярнуўся б да свайго заяўленага «Конь гуляў на волі», калі б захацелася «павольнічаць» у прозе — напісаць нешта нечаканае…

З'яўленне эсэ «Загадка Багдановіча» было і нечаканым, і чаканым. Чаканым таму, што Міхась Стральцоў быў ужо вядомы як тонкі, глыбокі прафесійны крытык, які не абмяжоўваў сябе толькі «поўзаннем» па канкрэтным твору, а глядзеў на яго ў кантэксце і ўсёй творчасці самога пісьменніка, і ў кантэксце літаратуры ў цэлым. Гэта датычыла і класікаў, і сучаснікаў. Нечаканым было таму, што так раскавана і шматбакова на Максіма Багдановіча ніхто яшчэ не спрабаваў глянуць. Не варта забываць, што Багдановіча яшчэ трэба было даносіць, нават прапагандаваць. Яго тады яшчэ бясспрэчна не называлі класікам. Найбольш значнаю на той час была чыста літаратуразнаўчая праца Алега Лойкі. Стральцоў паспрабаваў глянуць на Багдановіча шырэй, прасачыць яго шлях да беларускасці такога высокага кшталту. І паглядзець на Максіма як на проста жывога чалавека, якому было звычайна і цяжка, і адзінока — «маладому вераб'ю блага». Стральцову ўдалося падаць Максіма шчаслівага ў творчасці і няшчаснага ў жыцці. Магчыма, Стральцова турбаваў і самога нейкі трывожны знак, як і Багдановіча: ён быў упэўнены, што памрэ ў такім узросце, як і маці, ад сухотаў.

Міхась Стральцоў зрабіў у сваім эсэ цікавае назіранне: напісаныя на рускай мове Багдановічавы вершы ўяўляюць сабой даволі звычайнае пісанне, тыя ж вершы на беларускай мове набываюць іншае, сапраўднае гучанне. Тут ужо, відаць, загадка самой мовы. Мова, як і вада, якая забяспечвае чалавеку яго біялагічнае існаванне, прывычная і паштодзённая. Але таямніца вады і на сённяшні дзень не спасцігнута навукай. З моваю хутчэй за ўсё тое ж самае. «Вне родного языка мысли человека чужеродны…» — гэта Гегель.

«Багдановіч, побач з Купалам і Коласам, — тое трэцяе вымярэнне, без якога немагчыма перспектыва. З Багдановічам нам стала далёка відаць ва ўсе канцы свету», —сцвердзіў Міхась Стральцоў амаль паўстагоддзя назад. А наконт загадкі Багдановіча, то сам жа Стральцоў сказаў, што кожны талент — гэта загадка. Сёння ўжо ў акадэмічнай гісторыі беларускай літаратуры адкрытым тэкстам сказана і пра загадку самога Міхася Стральцова…

Міхась Стральцоў прыйшоў у паэзію адразу стала. Інтанацыю яго верша, як і яго празаічны настрой, нельга зблытаць ні з кім. У свой час Блок запісаў такую думку: «Стиль всякого писателя так тесно связан с содержанием его души, что опытный глаз может увидеть душу по стилю, путем изучения формы проникнуть до глубины содержания». Крыху грувастка, але дакладна.

Яшчэ задоўга да «Ядлоўцавага куста» мне давялося правесці ноч з Міхасём Стральцовым на яго новай кватэры, калі ён застаўся адзін. Амаль адзінай «мэбляй» у кватэры былі звязкі кніг ягонай бібліятэкі. І ноч напралёт Міхась чытаў вершы. Ён многа памятаў з айчыннай, замежнай і з рускай паэзіі. Але тады ён чытаў найбольш Блока. Магчыма таму, што ў самога яго пачыналася такая невыносна цяжкая паласа, якія як мінімум, два разы перажыў і Блок. Пра гэта можна было толькі здагадвацца: пра асабістае жыццё Міхась не гаварыў. Пазней ён напіша пра той час у вершы:

Вось сівізна — а мудрасць дзе?
А мо пакорлівасць бядзе
Завецца словам гэтым?
Бяда ідзе, бяду вядзе:
Калі міне, сустрэне дзе,
Пасварыць дзе са светам…

А тады, быццам ратуючыся ад скрухі, ён чытаў такія паэтычныя шэдэўры:

Ты рванулась движеньем
испуганной птицы,
Ты прошла, словно сон мой, легка,
И вздохнули духи,
задремали ресницы,
Зашептались тревожно шелка.

І раптам цяжкае, аб адзіноце ў вялікім свеце людзей, і пра сваё маленькае дарагое:

…Над смрадом, смертью
и страданьем,
Трезвонят до потери сил…

Над мировою чепухою;
Над всем, чему нельзя помочь;
Звонят над шубкой меховою,
В которой ты была в ту ночь.

А пасля ці то каб крыху супакоіцца і падбадзёрыць мяне сваім «всё будет хорошо, старичок», ці то каб вярнуцца ў цёплы туман паэзіі і сагрэцца ў ім:

Всё, что минутно, всё, что бренно,
Похоронила ты в веках!
Ты, как младенец, спишь, Равенна
У сонной вечности в руках.

А виноградные пустыни,
Дома и люди — все гроба.
Лишь медь торжественной
латыни
Поет на плитах, как труба.



Мова, як і вада, якая забяспечвае чалавеку яго біялагічнае існаванне, прывычная і паштодзённая. Але таямніца вады і на сённяшні дзень не спасцігнута навукай. З моваю хутчэй за ўсё тое ж самае

Паэзія самога Міхася Стральцова, у адрозненне ад таго ж Блока, не такая размашыстая і прагна ўсёахопная, хаця не меней філасафічная, я б сказаў, болей лірычна пранікліва і нават пяшчотная. Хаця метад параўнанняў заганны, калі гаворка заходзіць пра творчасць, напрыклад, для беларускай крытыкі заганны найперш тым, што творчасць аўтара міжвольна падвёрстваецца пад нейкі адпаведнік, нават пры большай відавочнасці таленту, пад творцу з шэрагаў «старэйшага брата». Хаця могуць быць і адваротныя выпадкі, калі творчасць у экстазе ўзносімага на вяршыні новаяўленага творцы пачынае лунаць нават і над сусветнай класікай. Праўда, і тое ўзнясенне, і тое лунанне звычайна вельмі кароткае па часе, і знікаюць неяк самі па сабе вельмі ж незаўважна.

Паэт — гэта чалавек, які застаецца адзін на адзін са светам, з сусветам, і спасцігнутае ім павінна адазвацца ў душах іншых, калі ён не зможа так сказаць, то ён застанецца адным са звычайных — усім людзям дадзена і адчуваць, і перажываць, адзінкам дадзена расказваць пра гэта іншым. Марына Цвятаева безаглядна смела сказала на пачатку творчасці: «Моим стихам, как драгоценным винам, настанет свой черёд». Наконт сябе яна ўвогуле не памылілася, хаця і самым-самым вінам прыходзіць свой канец…

Найвялікшае з цудаў, якое стварыў чалавек, гэта музыка, потым паэзія. Проза — чорны хлеб літаратуры. Музыку, паэзію трэба слухаць, жыць ёю, перажываць і суперажываць, тлумачыць яе нельга, яна сама гаворыць за сябе.

Лёг, маленькі-маленькі
На шамоткім плашчы
І падціснуў каленькі
Перад мечам начы.

* * *

Яны талмудзяць і глякуюць,
У іх сабака ў доме ёсць.
Прадбачу хвілю, у якую
Да іх прыходзіць раптам госць.

З якой, з якой, з якой пустыні?
Абтрос ён пыл з вунь тых дарог.
Няхай вячэра ваша стыне.
Хацелі Бога вы? Ёсць Бог.

Цытаваць Стральцова я магу многа, таму спынюся. Урэшце, паэзію перачытваць трэба самнасам, а не ў цытаванні…

…Тады, калі Міхась зайшоў да мяне ў «ЛіМ», у ім нешта было ад далёкае і цяжкае дарогі. Ён быў у акуратным касцюме, пры гальштуку, і не выглядаў змардаваным тым цяжкім лячэннем. Той жа прыжмур яго зеленаватых вачэй, той жа да болю знаёмы мне дымок ад цыгарэты. Я глядзеў на яго, і мне ўспамінаўся адзін з пагодлівых, ужо не спякотных, але цёплых і ласкавых асенніх дзён. Шчодра раскашавала ў парку Купалы барвовае, жоўтае, чырвонае лісце. Яго не пачыналі яшчэ зграбаць і вывозіць з паркаў і сквераў. Ад гэтага лісця, ад яснасці, сонечнасці душу кранала нейкая журботлівая радасць.

Угледзеў Міхася Лявонавіча нечакана, адзінокага на лаўцы. Ён сядзеў задумлівы і журботны ў такі святочны восеньскі дзень. Я тады не адважыўся падысці да яго…

Цяпер перада мной сядзеў чалавек, які намнога пасталеў і многае перажыў. Мне здалося, што ён адчувае нейкую палёгку. Так бывае з чалавекам, калі ён прыняў рашэнне.

Неўзабаве Міхась пачаў працаваць у «Нёмане». Жыццё, на якое, на жаль, заставалася ўжо зусім мала часу, наладзілася і пайшло звыклым парадкам. Пісаліся кнігі. Да прозы Міхась так і не вярнуўся.

Дазволю сабе працытаваць адзін верш з «Ядлоўцавага куста» цалкам.

* * *

Душа поет не то, что море…
Ф. Тютчев.

Прайшло, мінулася, як дым…
Няпраўда. Жыў я не за тым.
Няхай у гордай паняверцы
Сабе мы кажам «трын-трава»,
Зусім не тое тчэцца ў сэрцы,
Як часам трызніць галава.

І боль, і смех, сваім павевам
Ускалыхнуўшы сон душы,
Памруць, але не згінуць. Дрэвам
Такой не дадзена мяжы.

Свайго няма для іх. І травы,
Хоць імі прарастаем мы,
Не пад цяжарам гнуцца славы,
І не ад скрухі лес нямы.

Няхай не так. На гэтым свеце,
Калі закончыцца мой век,
Жальбу травы усё ж не вецер
Спасцігне — родны чалавек.

…Пішучы гэтае эсэ, я перачытваў напісанае Стральцовым і пра Стральцова, Багдановічам і пра Багдановіча, Блокам і пра Блока. Паэтаў зусім розных і па часе, і па тэматыцы, і па задачах, якія яны кожны ставілі перад сабою, словам, розных, розных бясконца… Але звязаных неаспрэчна адным — талентам, Божай міласцю дадзеным. І яшчэ — кароткасцю свайго быцця на зямлі.

Азірнёмся на трагічна кароткі час у зямным сваім існаванні айчынных творцаў, сусветных. Калі б скласці спіс, якім бы ён атрымаўся жахліва агромністым! У свой час суровы Міхаіл Еўграфавіч Салтыкоў-Шчадрын адназначна сцвердзіў, што літаратура непадуладна тленню. Дык гэтыя дачасныя смерці ці нішто іншае, як даніна, якая збіраецца з пісьменнікаў за іх непадуладнасць смерці, бо праз іх гэтая непадуладнасць працягаецца і на ўсё чалавецтва?

Молчат гробницы, мумии
и кости, —
Лишь слову жизнь дана:
Из древней тьмы,
на мировом погосте
Звучат лишь Письмена.

Паглядзім на сонечны захад і сонечны ўсход, на іх кругазварот. Ідзе спрадвечнае змаганне святла і цемры, і яно ніколі не бывае бяскроўным…

…Як гэта ўсё было нядаўна і даўно: у шэсцьдзясят восьмым годзе ўжо мінулага стагоддзя і тысячагоддзя, прадстаўляючы рускаму чытачу кнігу прозы маладога Міхася Стральцова «Что будет сниться», Янка Брыль пісаў: «На кожнай стральцоўскай старонцы я перш за ўсё бачу аднаго галоўнага героя — абаяльны вобраз самога аўтара, чалавека культурнага і душэўнага, з вострым позіркам на праўду і няпраўду, сапраўднага інтэлігента з народа, які вельмі нядрэнна засвоіў шматпакутную, складаную мудрасць часу. Шчыры чалавек, таленавіты пісьменнік ідзе па жыцці з добраю і журботнаю ўсмешкаю. Так хадзілі даўно і нядаўна яго вялікія папярэднікі. З гэтакім жа сумам, шчаслівым болем за ўсіх і за ўсё, горка і радасна ўсведамляючы сябе паэтам. І гэта не сузіральнасць, якой палохаюць нас некаторыя крытыкі, гэта высокая любоў прыгожага, новага, на чым і трымаецца жыццё».

Ужо болей за паўстагоддзя ідзе да людзей сваімі творамі Міхась Стральцоў — і не аддаляючыся, а набліжаючыся да новых пакаленняў.

ВЕРШЫ

І ДАРОСЛЫМ, І ДЗЕТКАМ

З КНІЖКІ «ВЕРШЫ ДЛЯ ХОМКІ»

Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК

Хомка і яго рада

Як згубіў свае ключы,
То маўчы, а не крычы;
Не звані ва ўсе званкі;
Лепей памяняй замкі,
Каб сусед ці сябар-зух
Не залез у твой катух!

Хомка і роварнік

Хомка мой стаяў на задняй лапцы
І на дзвюх пярэдніх… Ну, вядома,
Што рабіў ён у такой пастаўцы
Не ў забыўлівасці, а свядома.

Дык на задняй лапцы ці на ножцы
Ён стаяў, і ў гэты міг нячула
Роварнік па роварнай дарожцы
Праляцеў, — ажно Хаму хіснула.

Хомка ветлівы

Я скажу пра гэта проста:
Не вучыўся Хомка ў школе,
А на дзетак і дарослых
Ён не гаўкае ніколі!

Гаўкае хіба на дурня,
Для якога (Хомка знае!)
Родная літаратура
І слабая, і малая…

Хомку шанцуе

Хомка стаў пад клён… Глядзіць —
Дзвесце тысяч там ляжыць!

Стуалеціўшыся, ды
Сам сабе сказаў тады:

«Каб пад клён не захацеў,
Дзвесце б тысяч не займеў!»

Хомка-дырыжор

Манерамі дзівіць сваімі…
І часам (ну, чысты маэстра!)
Пярэднюю лапку падыме,
Нібыта кіруе аркестрам.

Хомка-спявак

Хомка выйшаў не з «Ла-Скалы»,
Але ён спявак удалы.
Ноту «гаў» бярэ свабодна —
То яснотна, то журботна…

І з адною гэтай нотай
Мае хлеб ён і да хлеба,
І яму (кажу з пяшчотай)
Ноты іншыя не трэба.

Хомка-пан

Быццам пан сабе які,
Хомка корміцца з рукі.


Вечарам — у пяць, у шэсць —
Хомка з міскі сам не есць.

Вам скажу, сябры мае,
Хомка з міскі толькі п'е.

І даводзіцца таму
Дома ўсім карміць Хаму.

Хомка і ратуша

Хомка любіць ад душы
Пахадзіць ля ратушы.
Пра яе гукнуць ён рады:
«Сімвал гарадской улады!»


Фота Дж. Кунстандэра

А яшчэ гукнуць ён рады:
«Рада засядала тут,
На паседжаннях той рады
Войт праводзіў строгі суд!»

Хомка і Купалаўскі парк

Хомка наш трымае марку…
Скажам так: не абы-дзе,
А ў Купалаўскім у парку
Шпацыруе кожны дзень.

То-бок, зранку і пад вечар,
Меставы забыўшы брук,
Ён у парку тым… Дарэчы,
Філасофствуе аб нечым
Ці дурэе, як хлапчук!

Хомка і хлопчык на роліках

Хлопчык на роліках — ах,
Як ён ляціць, не спыняецца…
І не бярэ яго страх,
І не баіцца параніцца!

Хомка з адкрытай душой
Крыкнуў на ўсё наваколлейка:
«Хлопчык на роліках, стой!
Дай пакатацца на роліках!»

Хомка і вавёрка

Ранішняю зоркай
З дрэва і на дол
Скокнула вавёрка…

А Хама пад стол
З мяккае канапы,
Бо не тыя лапы!
«Ах, вавёрка-зорка! —

Хомка ж уздыхне. —
Прыскачы, вавёрка,
Ў госці да мяне!

Мы не так, як людзі
Енчыць-сумаваць, —
А з канапы будзем
Мы пад стол скакаць!»

Хомка і яго вушы

У Хамы даволі працы:
Чысціць вушы пазурамі…
І выходзіць ён на шпацыр
Толькі з чыстымі вушамі!

Захад сонца адмыслова
Кідае ў Хаму праменне…
Вушы свецяцца ружова,
Як каштоўнае каменне!

Хомка і галубы

Як убачыць галубоў —
Гоніць іх з усіх кутоў!
Галубы (а так і трэба!)
З долу рвуць адразу ў неба!

Лозунг у Хамы адзіны:
«Каб шчаслівыя былі,
Птушкі ў небе быць павінны,
А сабакі на зямлі!»

Хомка і «Вольга!»

Ён — рахманы, але часам
Хоць ты шпогні Хомку пасам…
Выгне шыю і бачок
І стаіць, як той бычок,
Ці праўдзівей — асляўнятка…
Ні сюды і ні туды…

От загадка дык загадка,
Што рабіць з Хамой тады?

А папраўдзе, амбарасу
Тут вялікага няма —
Трэба выгукнуць адразу
Гаспадыніна імя.

Як Хама адно пачуе
«Вольга!» — то дзярэ грудок
І дадому так шыбуе,
Аж спявае павадок!

Хомка цікаўны

Хомка ўздыме галаву
І ў густую йдзе траву,
Бо цікава — хто жыве
У густой у той траве?

Абышоўшы цэлы груд,
Хомка прамаўляе тут:
«Я адкрыў, як двойчы два,
У траве жыве трава!»

Хомка і байкеры

«Будзьце, байкеры, людзьмі! —
Крыкнуць Хомка гэтак хоча. —
Жалязякамі сваімі
Не грыміце ўдзень і ўночы!

Грукату патрэбна вам?
У балота прыце ў дыме
І чарцей пужайце там
Жалязякамі сваімі!»

Хомка і Свіслач

З-за бетоннага паркана
Чуецца рака ледзь-ледзь…
Бліcне думка нечакана:
Свіслач там, а можа — смерць…

Хомка ўсё жывое любіць
І пытае сумна ён:
«Вы раку навошта, людзі,
Зацаменцілі ў бетон?!»

Хомка і ямка

Бегучы ў любым напрамку,
Пад тапаляй ці вярбой
Хомка выкапае ямку
І з вясёлаю журбой

Паглядзіць у ямку тую:
Мо крыху шчэ пагрябці?
Нібы цацку залатую
Хоча ў ямцы той знайсці…

Туалетную праграмку
Справіўшы, як мае быць,
Хомка закапае ямку
І далей ізноў бяжыць!

Хомка і шкло

Быццам некаму на зло,
Дзеці б'юць у парку шкло.
Увіхаюцца яны, —
Ажно гром грыміць шкляны!

Хомка на хвіліну стаў
І малым параду даў:
«Каб калецтва не было,
Дзеці, не таўчыце шкло!»

Хомка і дэкрэт

Хомка думае адзін,
Іншыя сабакі — не:
«Шмат у горадзе машын…
Дым уверсе і на дне!»

У задумлівай тузе
Хомка выдумаў дэкрэт:
«Трэба, каб сабакі ўсе
Гаўкнулі на цэлы свет:

— Зачыніце аўташколы
І жывіце, як ільвы!
З чатырох сыдзіце колаў
На чатыры лапы вы!»

Хомка-грамадзянін

У Хамы (хай кожны знае)
Мера гонару свая:
«Я таксама пашпарт маю —
Значыць, грамадзянін я!

З дарагой магу душою
І брахаць, і кіраваць…
Крэсла самае (ну, тое!)
Маю права я заняць!»

Хомка-філосаф

Філосаф Хомка наш, канешне,
Галосіць у акно: «А то!
Калі нішто, то будзе нешта;
Калі ж ні нешта, то — нішто!»

Хомка і лісце

Хомка лічыць: «Гаў-гуў-гоў!..» —
Ды няма карысці…
Хомка лічыць зноў і зноў
Восеньскае лісце.

Толькі скрозь яно ляжыць,
Шмат яго, о Божа!
Лісце ў парку палічыць
Хто Хаме паможа?

Хомка і пачварка

Напалохаў Хомка ў парку
Не пачвару, а пачварку, —
І маленькая пачварка
Уцякла ад Хомкі шпарка!

Хомка-псіхолаг

Наш Хомка псіхолаг вядомы —
Штодня без ніякае стомы
Параду і ў свята, і ў будзень
Дае і сабакам, і людзям:

«Калі не хапае чагосьці;
Калі вам захочацца штосьці —
Тады выбірайцеся ў госці
І будзьце ў гасцях аж да млосці!»

Хомка і паломка

Роварнік займеў паломку:
Хутка ездзіць ён прывык;
Заглядзеўшыся на Хомку,
Наляцеў на нейкі цвік.

Хомка гэтаму нябогу
Адчаканіў проста ў лоб:
«Каб глядзеў ты на дарогу,
То паломкі не было б!»


Фота А. Паплаўскай

АБРАЗКІ

УСЁ АЛЬБО НІЧОГА. ЖЫЦЦЁ — РЭДАГАВАННЕ

Аксана СПРЫНЧАН

Атамная рэДакцыя

Мой першы сябра-рэдактар, з якім лёс звёў працаваць у адным кабінеце шмат гадоў, Янка Саламевіч, любіў казаць пра сімвалічную памылку: атамны рэдактар. Ну а паколькі я паводле гучання ініцыялаў АЭС(АС), дык гэты жарт і на мяне перайшоў. А ў маёй сям'і і — атамная рэДакцыя пайшла, бо я рэдактар у трэцім пакаленні.

Расейскамоўныя іншапланяцяне

Прыйшоў у кабінет аўтар, паведаміў, што ён адчувае сябе іншапланяцянінам (бо мы размаўлялі па-беларуску). У анатацыі да сваёй кнігі ён напісаў: «Тема освещает одну из героических страниц в жизни русского народа: нашествие Наполеона на Россию». Вось яна, гераічная старонка ў жыцці рускага народа — нашэсце Напалеона. А ў жыцці беларускага рэдактара гераічная старонка — нашэсце расейскамоўных іншапланяцян.

Рэдактары таксама б'юцца

Упершыню за ўсю гісторыю выдавецтва адбылася бойка паміж двума рэдактарамі. Не праз жанчыну, не праз пляшку, не праз грошы, а праз Кнігу. Ёсць такія вялізныя кнігі, што іх вядуць некалькі рэдактараў. Дык вось Рэдактар, які з усёй душою працаваў над кнігай, даў у пысу рэдактару, які з усёю душою халтурыў над кнігай.

«Непадсільная доза»

Ліст адной з паэтэс рэдактару: «Я виноватая сама в своем провале. Я «отравила» Вас непосильной дозой красивого, сопутствующего прекрасной любви. Во мне эти строчки рождались в течение 10–15 лет, а Вам пришлось их усвоить в один присест. И вывод — налицо». Дзякуй Богу, «в один присест», а не за 15 гадоў.

Наглядная праца

Праца рэдактара з аўтарам можа быць не толькі слоўнай, але і нагляднай. Аднойчы дзед ніяк не мог патлумачыць паэту, што ягоныя радкі «И я немного приоткрыл уже распахнутую дверь» не адпавядаюць здароваму сэнсу. Урэшце рэшт рэдактару давялося ўстаць, адчыніць дзверы і сказаць аўтару:

— На, распахни.

Правіла ад рэдактара

Паводле новых правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі «літара Э ў запазычаных словах пішацца згодна з літаратурным вымаўленнем». Але як літаратурна вымавіць — сЭкс альбо сЕкс. Паколькі не толькі вымаўленне, але і сэкс у беларусаў вельмі разнастайныя, калісьці, яшчэ працуючы ў «Беларускай Энцыклапедыі», я стварыла свае правілы. Калі ваш сэкс бліжэй да Эротыкі, дык ён пішацца праз літару Э. А калі вы пішаце секс праз літару Е, дык зразумела, да чаго ён бліжэй... Трэба адзначыць, у адрозненне ад новых правілаў, у якіх цяжка разабрацца, гэтае правіла запамінаюць усе адразу і назаўсёды.



«Янка Саламевіч і я»

А як пісаць — газЭта ці газЕта? Паколькі журналіст — адна з найбольш старажытных прафесій, дык правіла можна і на газэту распаўсюдзіць: калі праз Э, дык бліжэй да эротыкі, а калі праз Е, дык і так зразумела, да чаго бліжэй...

У-у-у!

Супрацоўніца-карэктарка з дакорам: «Аксана! Ну няўжо ты не ведаеш, што сэкс нешта няпэўнае, нявызначанае? Чаму ж ты напісала ў Родным склоне «Сэкса». «У-у-у!» — «Сэксу-у».

Лекаванне

Варажу на ТАРАшкевіцы, лекую ад наркаманаўкі. (Наркаманаўку муж прыдумаў).

Дзіцячае рэдагаванне

Карэктарка ехала з маленькім сынам праспектам. На плошчы Якуба Коласа сын радасна закрычаў на ўвесь аўтобус: «Мама, мама, глядзі, вунь твой Ябук!»

Нават не для ворагаў

Ворагу не пажадаеш такое чытаць: «Повесть готова к изданию, состоит из 7 глав, что составляет 7 авторских листов. Жанр повести — остросюжетный детектив. Основная тема — проблема гуляющего по миру педофилизма и драматические судьбы малолетних жертв педофила... По количеству найденных в спальне педофила фотографий девочек и кукол, следствие считает, что насилию подверглись 83 девочки. Все девочки воспитанницы одного детского сада...».

Дзякуй за вершы! Дзякуй за прозу!

У лунінецкай газеце «Информпрогулка» ў раздзеле «Паэзія» пасля апублікаваных вершаў — рубрыка «Дзякуй за вершы!» І ў ёй наступнае: «Удзячныя за дасланыя вершы Тацццяне Паўловіч з в. Дубоўка і Анатолю Варонічу. На жаль, іх творы апублікаваныя не будуць». Па-мойму, гэта цудоўная ідэя. У кожным выдавецтве можна нават кнігі выдаць «Дзякуй за вершы!», «Дзякуй за прозу!» і г.д. Дарэчы, прозвішчы аўтараў вылучаныя тлустым шрыфтам.

Крыху па-расейску

Калі чытаю дачцэ кнігі беларускіх пісьменнікаў і не выпраўлю раптам русізм, дачка пытаецца:

— А што, гэтая кніга КРЫХУ па-расейску напісаная?

Дык вось, 90 адсоткаў беларускіх кніг напісаныя КРЫХУ ПА-РАСЕЙСКУ. І аўтараў гэта мала абыходзіць, бо яны пераважна і самі нават з роднымі па-расейску размаўляюць, і рэдактараў не шануюць, і проста не разумеюць, бо ніхто ж ім у вочы праўды не скажа. На прыкладзе выдавецкага рэдактара зазначу гэтак: калі аўтар прыносіць свой твор, у яго павінна ўжо быць да мяне некалькі рэдактараў, «вылізаны» тэкст, каб у мяне рэзка падвышаўся адрэналін, калі я нешта знайду.

Рэстарацыі і рэдактура

У савецкія часы, калі выходзіла кніга, ганарары былі такія, што аўтар вёў у рэстарацыю ўсё выдавецтва. Калі, вядома ж, не быў жахлівым скнарам. Зразумела, і сам пэўны час жыў бязбедна.

Чытаючы кнігі пісьменнікаў тых часоў, ніяк не магу зразумець: няўжо пісьменнік не мог наняць пяць рэдактараў (бо аднаго заўжды мала!), каб яму адрэдагавалі твор лепей.

Цяпер іншыя часы — ганарара не стане і на двух рэдактараў. А скваліснасць бывае такая, што нават святое святых — кнігу, якая выйшла, — не падораць рэдактару. Раней такога ніколі не было.

Дзяльба

Прыйшоў аўтар у кабінет, дзе было два рэдактары, і вырашыў іх пачаставаць. Дастаў яблычак, узяў са стала нажніцы, расчыкрыжыў і даў па кавалку кожнаму.

Распытваю іх пасля:

— А што, вялікі яблык быў?

— Ды не, маленькі, нягеглы.

— Дык, можа, смачны надзвычай?

— Ды не, ніякі.

— Дык мо патлумачыў нейк сімвалічна?

— Ды не, без гісторыі.

— Дык год жа яблычны.

— Дык аўтар такі.

Жыццё без кветак

Вядома ж, хто будзе дарыць рэдактару-мужчыне кветкі? Ніхто. А рэдактару-жанчыне? Мне не дарылі. Колькі не распытвала знаёмых рэдактарак, нават у часы «Юнацтва» такога не было. Рэдактару «прынята» паіць і карміць — відаць, каб не адрываліся ад рукапісу, кавалак хлеба не шукалі, альбо паляпшаць умовы працы — гарбатнічак падараваць альбо сканер.

Адна ноч Васіля Быкава

У 80-я гады, калі перавыдавалі кнігу, здзяйснялі цалкам забыты цяпер працэс — расклейку. Каб атрымаць адзін экземпляр гэтай расклейкі, былі патрэбныя два асобнікі папярэдняй кнігі. Кожная старонка выразалася і наклейвалася на аркуш паперы фармата А4. Так утвараўся новы рукапіс. Кнігі часта даводзілася браць у бібліятэках, а пасля аддаваць у падвоеным памеры. Але якая бібліятэка аддасць парэзаць Васіля Быкава? Рэдактарка патэлефанавала Васілю Уладзіміравічу, папрасіла яго аддаць на «смерць-жыццё» дзве кнігі, паведаміла, што прыедзе забраць, але Васіль Быкаў сказаў, што будзе заўтра недалёка ад выдавецтва і сам падвязе. Зранку наступнага дня Быкаў прыехаў, прывёз гатовую расклейку і перапрасіў, што не пранумараваў старонкі. Усю ноч з жонкай клеіў. Вось такія былі сціплыя пісьменнікі.

Медрэдактары

Пасля васьмі гадоў працы ў выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя» я перайшла працаваць у «Мастацкую літаратуру». І ў «Энцыклапедыі» даводзілася сустракацца з пісьменнікамі, калі пра іх рабіла артыкулы. Але ў такой іпастасі яны былі зазвычай спакойныя і адэкватныя. А вось праз месяц працы ў «Мастацкай» у мяне нават узнікла думка, што я не пісьменніца, бо, прыходзячы ў выдавецтва, не спяваю, не чытаю, не плачу, не сяджу гадзінамі, не абяцаю, не праклінаю, не кідаюся біцца. Цяпер у Тэхналагічным універсітэце пачалі рыхтаваць рэдактараў-тэхнолагаў. Лепей бы падрыхтавалі рэдактараў-псіхолагаў, -псіхатэрапеўтаў і -псіхіятраў. Альбо хаця б медрэдактараў.

Кнігі не пахнуць

Аднойчы ў часы БССР у кабінет, дзе сядзела рэдактарка з загадчыкам рэдакцыі, завітаў Адам Мальдзіс і перадаў ад аўтара, кнігу якога рэдактарка нядаўна рэдагавала, скрыначку цукерак «Кароўка». Рэдактарка нагрэла гарбатнік, паставіла кубкі і адчыніла цукеркі. Цукерак не было. А была французская парфума. Загадчык, застаўшыся без цукерак, пажартаваў, што рэдактарцы давядзецца рэдагаваць і наступную кнігу гэтага аўтара, а інакш трэба паехаць на паштамт і адправіць пісьменніку ягоную парфуму. Узгадаўшы жахі рэдагавання першай кнігі, рэдактарка пасля працы паехала на паштамт. Зранку яна адрапартавала начальніку, што ўсё сказанае ім выканана. Ён доўга не мог зразумець — што, а пасля быў дужа ўражаны: ён жа пажартаваў. Як бы там ні было — болей кніг гэтага аўтара рэдактарка не рэдагавала.

Пракурор і адвакат

Калі пісьменнік не ведае, як напісаць «пра гэта», атрымліваецца наступнае: «Тады яна скіроўвала позірк на нешта іншае: голыя плечы, жывот, ягадзіцы і на ўсё тое, што траплялася ёй на вочы». Парагатаўшы з калегамі над чарговай цытатай, патлумачылі рэдактару кнігі, што немагчыма глядзець адначасна на жывот і ягадзіцы. Але яна, вырашыўшы да апошняга абараняць свайго аўтара, падумала і прапанавала версію: «А калі ў яго вялізны жывот, і ён ляжыць на баку, дык і магчыма». Што ж, рэдактар не толькі пракурор, але і адвакат.

Скрыжаванне паралельных

Дзяўчынка суседзяў па лецішчы вырасла і прыйшла працаваць у Міністэрства культуры. Пабачыўшы мяне на калідоры, яна была нагэтульскі ўражаная, што ў яе міжволі вылецела: «А Вы, аказваецца, такая прыгожая! Так апранаецеся файна...!». І я ўявіла, як дзвццаць гадоў яна мяне бачыла з капачамі і вёдрамі з гноем... Рэдагаванне дазваляе быць прыгожым, а зямля — быць.

Смяротнае пакаранне

Перыядычна знаходзяцца аўтары, якія абяцаюць-пагражаюць, калі іх не выдадуць, засіліцца альбо сканаць (без удакладнення, якім шляхам). І гэтыя «смяротныя пакаранні» вісяць над ні ў чым невінаватымі выдаўцамі.

Але яшчэ не было ніводнага аўтара, які б абяцаў павесіцца, калі яго выдадуць без рэдагавання.

Пісьменны стол

У рэдагаванні, як і ў кожнай працы, бывае руціна: сядзіш сабе і вылоўліваеш па 10 разоў на старонцы «бышцам», альбо «гэта», альбо «толькі»... А пасля лясь — і жыццё пачынае віраваць. Бо ты сустракаеш «стол пісьменны, вялікі, дзьвюхтумбавы», ці «яна дакранулася патыліцай да спіны (сваёй)», ці «абцягнула халат на такіх жа, як і зад, вялікіх, дзябёлых грудзях». І ўжо няма табе спакою, думаючы, а ці бываюць такія ж вялікія грудзі, як дупа, ці ўсё ж такі дупа заўжды большая. І думаеш, як добра, што бываюць памылкі з пачуццём гумару.

Кнігі і тлушч

Як толькі ягоная кніга пабачыла свет, пісьменнік К. запрасіў рэдактара ў кавярню адзначыць шчаслівую падзею. А за чаркаю і падпісаў рэдактару кнігу. Падпісаў прыгожа, і рэдактар, вярнуўшыся ў кабінет, стаў хваліцца. Ягоны калега ўзяў кнігу і пабачыў, што яна ўся ў тлушчы. Але адзначаны рэдактар цалкам паважна патлумачыў:

— Нічога, заўтра ўсё нармалёва будзе, кнігі маюць здольнасць да нармалізацыі. Галоўнае — каб тлушч з іх не крапаў.

Расхадуха

Хоць рэдактары цяпер такія, што няма з кім выпіць, але традыцыя алкагольнага прэзенту найбольш трывалая з савецкіх часоў.

— Што вы болей любіце піць? — дапытваюцца шчаслівыя аўтары, задаволеныя выданнем кнігі.


— З добрымі пісьменнікамі — усё люблю. А з благімі — нічога.



АФАРЫЗМЫ

ДЗЕ ПАЛЯЦЬ КНІГІ, БУДУЦЬ ПАЛІЦЬ І ЛЮДЗЕЙ

Генрых ГАЙНЭ (1797–1856)



Дзіўная рэч! І заўсёды гэта рэлігія, заўсёды мараль, заўсёды патрыятызм — менавіта імі ўпрыгожваюць усе непрыемныя суб'екты свае напады! Яны кідаюцца на нас не дзеля дробязнага прыватнага інтарэсу, не з пісьменніцкай зайздрасці, не ад прыроджанага лёкайства, але ў імя дарагога Госпада, дзеля ўратавання маральнай прыстойнасці грамадства і айчыны.

Там, дзе паляць кнігі, урэшце будуць паліць і людзей.

Для людзей, якія ведаюць толькі мінулае і будучыню і не могуць пражываць вечнасць у кожным моманце цяперашняга, — вось для іх смерць мусіць быць жудаснай! Калі ў іх адняць абедзве мыліцы — прастору і час, — яны падаюць у вечнае Нішто.

Мы маглі б падзяліць людзей усяго на дзве групы — тых, хто нас любіць, і тых, хто часта і выразна кажа нам, што нас любіць.

Мы часцей думаем пра тых, каму, прамарудзіўшы, не адказалі, чым пра тых, каму заўжды пішам вымушаны ліст ветлівасці, спрабуючы такім чынам як мага хутчэй адчапіцца ад іх.

Мы почасту дастаткова талерантныя, каб захапляцца дурнямі і дараваць злодзеям, калі толькі пра іх можна сказаць, што яны дзейнічалі паслядоўна.

Я ведаю, што нельга лепей ушанаваць вялікіх асобаў, чым асвятляючы іх хібы гэтак жа добрасумленна, як і цноты. Апяваючы Геракла, трэба таксама згадаць, што аднойчы ён зняў з сябе львіную шкуру і сядзеў за прасніцай; пры гэтым ён усё адно застаецца Гераклам.

Да рэнегатаў, перавернутых колішніх аднадумцаў, адчуваеш значна большую непрыязнасць, чым да старых ворагаў.

Народ ахвотна закідвае камянямі сваіх пракокаў, каб яшчэ больш палка ўшаноўваць іхныя мошчы; сабакі, што абрэхваюць нас сёння, заўтра даверліва ліжуць нам рукі.

Людзі заўжды робяцца кепскімі, калі кепска ставіцца да іх.

Як і ў камерцыі, рэлігіям шкодзіць манаполія; дзякуючы вольнай канкурэнцыі яны застаюцца моцнымі і толькі тады могуць дасягнуць сваёй першапачатковай велічы, калі забяспечваецца палітычная роўнасць богаслужэнняў, так бы мовіць, камерцыйная свабода багоў.

Калі Айчына — першае слова для палякаў, то Свабода — другое. Цудоўнае слова! Поруч з Каханнем — напэўна, найпрыгажэйшае.

Руку, якую пакуль непажадана адсекчы, даводзіцца цалаваць.

У літаратуры, як і ў жыцці, у кожнага сына ёсць бацька, якога ён, праўда, ужо не ведае альбо ўвогуле хацеў бы ад яго адрачыся.

Няма нічога дурнейшага, чым пытанне, які паэт больш вялікі за іншых. Полымя ёсць полымя, і яго вагу нельга памераць у фунтах ці унцыях. Толькі прымітыўны гандляр прыходзіць са сваімі нікчэмнымі вагамі і хоча ўзважыць генія.

Пераклаў з нямецкай
Аляксей Жбанаў

АПАВЯДАННЕ

СПАТКАННЕ З НІНАЙ

Герман ГЕСЭ (1877–1962)

Калі я праз некалькі месяцаў адсутнасці вяртаюся на сваё Тэсінскае ўзвышша, кожны раз мяне ўражвае і кранае яго прыгажосць. Я не проста трапляю дадому — спачатку мне даводзіцца перасадзіць сябе ў іншую глебу і пусціць новыя карані, зноў звязваць парваныя ніткі, прызвычайцца і пашукаць судакрананні з мінулым і Радзімай, перш чым паўднёвае сельскае жыццё пачне набываць смак. Трэба не толькі распакаваць валізы і адшукаць вясковы абутак і летнюю вопратку — трэба праверыць, ці не пацякла за зіму спальня, ці жывыя яшчэ суседзі, трэба паглядзець, што тут змянілася за паўгода, наколькі ў гэтай дарагой мне мясціне агаліла-ся цнатлівасць, якую яна здаўна зберагае, ці напоўнілі яе даброты цывілізацыі. Ну вось, каля ніжняга яра зноў залысіна — высечаны цэлы ўзлесак, бо будуецца віла, — а на павароце нашую вуліцу пашырылі, загубіўшы чароўны стары сад. Апошнія станцыі з паштовымі карэтамі ў нашай мясцовасці ліквідаваныя і замененыя аўтамабілямі: новыя карэты занадта вялікія для гэтых старых вузкіх завулкаў. Значыць, я ніколі не ўбачу старога П'еро з яго двума наравістымі конямі, не ўбачу, як ён у блакітнай уніформе з шоргатам спускаецца з гары на жоўтай карэце, ніколі не заспею яго ў «Грота дэль Пацэ», дзе ён акурат паддаецца спакусе выпіць чарачку віна, зрабіўшы маленькі неслужбовы перапыначак. Божа, я больш ніколі не буду сядзець над Лугана на цудоўным ускрайку лесу, маім улюбёным месцы для малявання: нейкі чужак купіў лес і луг ды абгарадзіў іх калючым дротам, а там, дзе стаялі прыгожыя ясені, цяпер будуецца гараж.

Насупроць, як і раней, зеляняюць пад вінаградняй лазой палоскі свежай травы, а пад звялым лісцем, як заўсёды, шалясцяць блакітна-зялёныя ізумрудныя яшчаркі. Лес расквечаны блакітным і белым колерамі барвенку, анемонаў і кветачак суніц, а праз лес, падфарбаваны маладой зелянінай, прахалодна і мякка прасвечвае возера...

Ва ўсякім разе, лёс падарыў мне цэлае лета і восень, і я спадзяюся без турботаў зноў пражыць тут некалькі месяцаў і крыху адбіцца ад падагры — цешыцца доўгімі днямі на волі, забаўляцца з фарбамі і трошкі больш радасна і нявінна пражываць жыццё. Зімой, тым больш у гарадах, такой магчымасці меней. Гады пралятаюць хутка — басаногія дзеці, якіх я бачыў школьнікамі, уяздзжаючы ў вёску некалькі гадоў таму, ужо пажаніліся ці апынуліся ў Лугана альбо Мілане за друкаркамі ды прылаўкамі, а колішнія старыя — вясковыя старажылы — за гэты час памерлі.

Тут мне прыпамінаецца Ніна... Ці жывая яна яшчэ? Божа, Божа, як гэта я толькі цяпер успомніў яе? Ніна — мая сяброўка, адна з нешматлікіх блізкіх сябровак у гэтай мясцовасці. Ёй 78 гадоў, яна жыве ў самай аддаленай вёсцы, якую яшчэ не захапіў новы час. Дарога да яе крутая і нялёгкая, я на сонцы мушу некалькі сотняў метраў спускацца з гары, а потым падымацца з іншага боку. Але я адразу кірую ся ў дарогу і спачатку хуценька збягаю праз вінаграднікі і лес уніз, потым перасякаю вузкую даліну і з іншага боку падымаюся ўверх па выступах, якія летам зарастаюць цыкламенамі, а зімой — марознікам. Першае сустрэчнае дзіця ў вёсцы я пытаю, як маецца старая Ніна. О, расказвае мне малы, яна ўсё яшчэ сядзіць вечарамі на царкоўным муры і нюхае тытунь. Я, задаволены, іду далей: значыць, яна жывая, я яе яшчэ не страціў, яна мяне ласкава прыме і хоць пачне крыху бурчэць ды скардзіцца, а ўсё ж зноў пакажа мне добры прыклад самотнага старога чалавека, які, не прыніжаючыся перад жыццём, шчыра, упарта і не без радасці трывае свой узрост, сваю падагру, сваю беднасць і адзіноцтва, плюе на іх і да апошняй гадзіны не збіраецца ісці ні да доктара, ні да папа.

Павярнуўшы са сляпучай вуліцы, я пайшоў міма капліцы ў цень старажытнай змрочнай мураванкі, якая нехлямяжа і трывала стаіць на скале з іншага боку гары і не лічыць часу, не ведае іншага сёння, акрамя сонца, якое вяртаецца з веку ў век, не ведае іншай змены, акрамя змены пораў года. Дзесяцігоддзе за дзесяцігоддзем, стагоддзе за стагоддзем. Калі-небудзь гэтыя старыя мураваныя сцены абрынуцца, гэтыя прыгожыя, змрочныя антысанітарныя куткі перабудуюцца і абрастуць цэментам, бляхай, водаправодам, гігіенічнымі прыстасаваннямі, грамафонамі ды іншымі культурнымі дабротамі, над касцямі старой Ніны вырасце гатэль з французскім меню альбо летняя віла нейкага берлінца. Але сёння гэтыя сцены яшчэ стаяць, і я пераступаю праз высокі каменны парог, падымаюся па крутой каменнай лесвіцы ў кухню маёй сяброўкі Ніны. Тут, як заўсёды, пахне каменем, і прахалодай, і сажай, і кавай, і — асабліва моцна — дымам ад сырога дрэва, а на каменнай падлозе перад велізарным камінам сядзіць на сваёй нізенькай лавачцы старая Ніна. У каміне гарыць агеньчык, ад дыму якога яе вочы крыху слязяцца, а яна рудымі скручанымі ад падагры пальцамі засоўвае ў агонь рэшту дроў.

— Прывітанне, Ніна, беражы вас Бог, вы мяне яшчэ памятаеце?

— О, сіньёр паэта, caro amico, son content di rividerla! [1]

Яна ўстае, хоць я гэтага не хачу, устае, і таму ёй патрэбны час: цяжка даць рады нягнуткім нагам. У яе левай руцэ дрыжыць драўляная табакерка, грудзі і спіна абвязаныя чорнай ваўнянай хусткай. Са старога прыгожага твару драпежнай птушкі сумна і насмешліва пазіраюць пранізлівыя разумныя вочы.

Яна глядзіць на мяне па-сяброўску кпліва: яна ведае «стэпавага ваўка», ведае, што хоць я і сіньёр, і мастак, але ўсё ж невялікая шышка, што я ў адзіноце блукаю па Тэсіне, зведаўшы, як і яна, зусім няшмат шчасця, хоць няма сумневу, што мы абодва вельмі яго жадалі. Шкада, Ніна, што ты нарадзілася на сорак гадоў раней за мяне. Шкада! Не кожны лічыць цябе прыгожай, таму-сяму ты падаешся хутчэй старой ведзьмай з чырвонымі вачыма, пакрыўленымі рукамі-нагамі, брудными пальцамі і нюхальным тытунём пад носам. Але што гэта за нос на зморшчаным арліным твары! Якая ў цябе пастава, калі ты выцягнешся ва ўвесь рост! А якія разумныя, якія горды, якія пагардлівы, хоць і не злосны, позірк тваіх выразных, вольналюбівых, адважных вачэй! Якой прыгожай дзяўчынай была ты, пэўна, сівенькая Ніна, якой прыгожай, мужнай, парадзістай жанчынай! Ніна нагадвае мне пра мінулае лета, пра маіх сяброў, сястру, каханую, якіх яна ведае, і адначасова пільна прыглядае за чайнікам, заўважае, калі закіпае вада, засыпае з кавамолкі каву, ставіць кубак, прапануе мне табакі — і вось мы сядзім каля агню, п'ем каву, плюём у агонь, распытваем, расказваем, урэшце змаўкаем, зноў гаворым пра падагру, пра зіму, пра сумнеўнае жыццё.

— Падагра! Б..дзь гэта, заклятая б..дзь! Брудная путана! Няхай яе чорт забяры! Няхай яна здохне! Ай, не будзем ляяцца! Я радая, што вы зайшлі, вельмі радая. Застанемся ж сябрамі. Цяпер, у старасці, не вельмі каго дачакаешся... Мне семдзесят восем...

Яна зноў з цяжкасцю ўстае і ідзе ў суседні пакой, дзе ў люстэркавай раме — пабляклыя фатаграфіі. Я ведаю, што яна шукае мне падарунак. Нічога не знайшоўшы, яна прапануе мне старую фотакартку, і калі я адмаўляюся, то мушу яшчэ хаця б раз нюхнуць з яе табакеркі.

У закопчанай кухні маёй сяброўкі не надта чыста: тут парушаныя ўсе санітарныя нормы, падлога запляваная, а з саламяных крэслаў звісаюць вырваныя пукі, і мала хто з вас, чытачоў, ахвотна выпіў бы з гэтага кафейніка, гэтага бляшанага жбанка з зацвярдзелым налётам высахлай кавы, які пачарнеў ад сажы і пашарэў ад попелу. Мы жывем тут за межамі сённяшняга свету і часу, жывем хоць і беднавата ды непрыглядна, крыху запушчана і не зусім дагледжана, затое блізка ад гары і лесу, побач з козамі і курамі, што квохчуць і бегаюць па кухні, поплеч з ведзьмамі і казкамі. Кава з пагнутага кафейніка мае цудоўны смак, моцная чорная кава з лёгкім, пахкім і горкім прысмакам дыму ад дроваў, і гэтыя пасядзелкі за кавай, і лаянка, і пяшчота, і адважны стары твар Ніны бясконца даражэйшыя мне за дванаццаць запрашэнняў на гарбату з танцамі, за дванаццаць вечароў з размовамі пра літаратуру сярод славутых інтэлектуалаў, хаця я, безумоўна, не адмаўляю адносную вартасць гэтых сімпатычных рэчаў.

Там, за сценамі, заходзіць сонца. У пакой зазірае Нініна кошка і залазіць да яе на калені, водсветы агню ўсё ярчэй бліскаюць на тынкаваных каменных сценах. Якой халоднай, якой жудасна халоднай бывае, пэўна, зіма ў гэтай высокай каменнай пустэчы, дзе няма нічога, акрамя маленькага адкрытага агню, які палае ў каміне, і старой самотнай жанчыны з падаграй, што жыве тут з адной толькі кошкай і трыма курамі.

Кошку яна праганяе. Потым зноў устае, высокая і падобная да прывіда, і стаіць у цьмяным святле — худая, нават кастлявая фігура з белымі валасамі і строгімі вачыма на твары драпежнай птушкі. Яна не адпускае мяне. Яна запрашае мяне яшчэ гадзінку пабыць яе госцем і ідзе па хлеб і віно.

[1] Дарагі сябра, як я радая зноў цябе бачыць! (іт.).

Пераклаў з нямецкай
Уладзімір Папковіч

АПАВЯДАННЕ

Я ЦЁМНАЙ НОЧКАЙ МРОІЎ...

Эрых Марыя РЭМАРК
(1898–1970)



Вы, снежаньскія ночы 1917-га! Вы, ночы ў лазарэце, поўныя стогнаў і абрывістых крыкаў! Што значаць успаміны пра вас сёння, у часіну, якую ліхаманіць ад прагі да вайны і неміралюбства! Яшчэ не ўсё забылі, што ўзнікала тады з бруду і шрасці, зноў зніклі гады, калі зямля атрымала больш крыві, чым дажджу?

Вы, ночы, у якія змрочнымі таварышамі ўсім былі мучэнне і смерць, туга па радзіме і смерць! Вы, ночы, над якімі зіхацець МІР НА ЗЯМЛІ, як віна і жалоба! Вас нельга забываць, вашая перасцярога ў гэтыя дні смуты не павінная быць занядбаная! Ніколі!

Чырвоны цагляны будынак шпіталя высока засыпала снегам, вецер грукаў у вокны, бляклае святло лямпаў на калідорах ледзь цеплілася, у трубах замерзла вада, а побач са мной у палаце, на падушках, падсунутых пад параненую спіну, ужо тыдзень паміраў унтэр-афіцэр Герхарт Брокман.

Раней, да вайны, ён быў настаўнікам у невялікай вясковай школцы. Калі ён яшчэ мог гаварыць, то часта расказваў пра гэта. Нас ляжала тады чацвёра ў палаце, і Брокман яшчэ верыў, што праз некалькі месяцаў ачуняе, і яго камісуюць. Ён хацеў вярнуцца ў пачатковую школу побач са старымі вясковымі могілкамі, дзе гулі пчолы і матылькі, упрыгожваючы надмагіллі, быццам ордэны, — назад да барозавых прысадаў у светлым змярканні лета, назад да свайго класа з піяніна і мноствам кніг на паліцах, назад да гэтага цэлага сусвету спакою, які існаваў калісьці.

— Дзеці, а потым... — сказаў Герхарт і, абапершыся на локаць, узняўся так, што шэрыя рукавы задраліся на схудннелых руках, — цэлы ўрок спявалі! Гэта самае цудоўнае! У нас была песенька... Яе мы маглі спяваць ажно на тры галасы! Верыце ці не, але народная школка з адзіным класам спявала на тры галасы, як хор. Не ведаю, ці знаёмы вам матыў «Я цёмнай ночкай мроіў...» Мне неабходна пачуць яе яшчэ разок...

Было цяжка вытрываць яго хуткі, пранізлівы позірк. Мабыць, песня для яго шмат значыла, бо ён часта да яе вяртаўся. Магчыма, яе спявала дзяўчо, якое ён кахаў. Нават пасля, калі памерлі Петэрсан і Фішэр, ён пачынаў менавіта з яе, нават калі я рэзка абрываў:

— Так, я ведаю яе, Герхарт, нават усе строфы.

Ён чакаў, пакуль прыйдзе ардынатарская сястра, каб прачытаць ёй песеньку. Часам ён спрабаваў наспяваць мелодыю сіплым, надрыўным галасам. Калі голасу не заставалася, гэта нагадвала апошнія думкі, якія, як мухі, гулі ў абцягнутым скурай чарапным звоне. Трыццаць гадоў, Герхарт Брокман, нескразное раненне ў лёгкае, сухоты. Ён выглядаў на восемдзесят.

Вы, снежаньскія ночы 1917-га! У кастрычніку, калі ападала лісце, пачаліся смерці. Спачатку нас было чацвёра ў палаце, цяпер засталіся толькі Брокман і я. Снег біў у вокны, быццам нябачны гадзіннік, дзверы аддаляліся, смерць блукала вакол шпіталя, тэмпература выпаўзала з кутоў, а сон не змыкаў павекаў. Але калі ён прыходзіў, прыносячы цяжкія мроі, я прачынаўся ад ціхага стомленага голасу з кута палаты. Голас шаптаў, захлынаючыся ў змроку: «Святла... святла... Богам маю...» Потым у вачах Брокмана з'яўляўся агеньчык, які цьмяна і трывожна зззяў на пустым твары. Павольна і дапытліва Герхарт абводзіў позіркам пакой, быццам некага шукаў. Ён ніколі не хацеў спаць: думаў, што так не памрэ.

Калядная раніца выдалася шэрай і сумнай. Медсёстры ў вялікай зале лазарэта зладзілі свята, упрыгожылі елку ліхтарыкамі, шарамі і каніцеллю, а кожны з нас атрымаў у падарунак яблыкі, кексы, цыгарэты і нават пару шкарпэтак. У абед да мяне прыйшлі. Мой таварыш Людвік Браер. Мы згубілі адзін аднаго ў Фландрыі падчас наступлення, і мне даводзілася чуць, што ён загінуў. Але цяпер ён стаяў перада мной здаровы, збіраючыся ў адпачынак на чатырнаццаць дзён. І ўсё ж са Святога вечара не прыйшоў ніводны сапраўдны сябар. Усе ведалі: Брокману засталося жыць вельмі мала.

Канцылярыя марна спрабавала адшукаць родных і тэлеграфаваць, каб нехта прыехаў пабыць з Брокманам апошнія дні. Не ўдалося. Бацькі памерлі, братоў і сясцёр у яго не было, а на іншыя пытанні ці мог ён цяпер адказаць? Ён цэлы дзень толькі хрыпеў.

Людвік Браер сядзеў у мяне, пакуль не пачало змяркацца. Ён хацеў дадому, да маці.

— Не злуйся, — прамовіў ён. — Я да гэтага не звыклы. У атацы ўсё імгненна, яно вельмі не так. А тут працінае да нырак, нават больш, чым калі полк бяжыць на пару тузінаў аўтаматаў.

Я кіўнуў і глядзеў у акно яму ўслед, пакуль ён не знік. Потым запаліў святло — ну і няхай медсёстры лаюцца на абходзе, маўляў, трэба эканоміць і да таго ж вельмі рана. Я накульгваў, ідучы ў палату да лёгка параненых, але не хацеў пакідаць Брокмана аднаго. Не хацеў я і заставацца з ім у цемры, бо і без гэтага шмат думаў пра тых, што тут памерлі. Таму я лёг на ложак апранутым. Мне падалося, што так будзе лягчэй трываць стогны Брокмана. Потым мне зрабілася абыякава.

Ардынатарская сястра зайшла ў палату раней, чым звычайна. Я адразу ж пацягнуўся выключыць лямпу, але яна не звярнула на гэта ўвагі, падышла да ложка Брокмана і нахілілася.

Крыху паслухала, потым пацiснула плячыма. У дзвярах з'явіўся бляклы вузкі твар аперацыйнай сястры.

Я не разумеў, што адбываецца. Як можна апераваць Герхарта?! Я адразу ўскочыў. Аперацыйная сястра ўсміхнулася. Гэта мяне засмуціла, бо калі яна ўсміхалася, за гэтым звычайна хавалася нешта небяспечнае. Магчыма, яна думала пра мяне і хацела яшчэ раз аднесці на бойню.

Але тут яна падышла да Брокмана, а затым прамовіла: «Мы можам паспрабаваць».

Я здзіўлена прыпадняўся. Перад расчыненымі дзвярыма па калідоры пракрочыла група дзяцей. З імі была маладая дзяўчына.

— Гэта настаўніца, — прашаптала мне сястра. — Яна ляжыць ужо тыдзень у жаночым аддзяленні. Мы расказалі ёй пра Брокмана, і яна прывяла клас, каб Герхарту было радасна на Каляды. Спадзяюся, ён пачуе.

— Што? — запытаўся я, і нейкае падазрэнне сціяла мне дыханне, а яны зайшлі і заспявалі тонкімі галасочкамі: «Я цёмнай ночкай мроіў і бачыў цяжкі сон».

Мяне быццам ударылі, і ўсё ўва мне перавярнулася. Яны пра гэта думалі! У паўасветленай палаце, дзе лунаў пах смерці, у мяне з'явілася адчуванне, што да нас вярнулася страчаная Радзіма, вярнулася і павітала нас. Камяк падкаціў да горла. Але я сабраўся з сіламі і зірнуў на Брокмана: ці чуе ён песню? Першую страфу ён ляжаў не варушачыся. Сястра махнула рукой, і дзеці падышлі бліжэй. Яны пачалі другую страфу. Рукі Брокмана, быццам мышы, замітусіліся па коўдры. Потым ён раскінуў рукі і так ляжаў, быццам скарыўся лёсу. Я падумаў, што гэта канец, але тут ён расплюшчыў вочы — вялізныя, пяшчотныя, з нейкім невытлумачальным выразам. Твар быў падобны да краявіду на кратэры — нерухомы, спустошаны, шэры, — але вочы былі прыгажэйшыя, чым вочы дзяўчыны, якая спявала з дзецьмі. У гэтых вачах быў спакой, якога не было на твары.

Песня скончылася. Брокман не варухнуўся. Ён ляжаў вельмі ціха. Настаўніца кіўнула, і дзеці пачалі песню зноў. Тут Герхарт павярнуў галаву, быццам слухаў, і нешта падобнае да баязлівай лёгкай усмешкі прабегла па яго твары. Ён заварушыў вуснамі. Я схіліўся над ім. Спачатку словаў было не разабраць, таму я пасунуў трохі вышэй падушку пад ім.

— На тры галасы, — шаптаў ён, — на тры галасы...

Ён змоўк і паглядзеў на дзяўчыну. Яна была вельмі маладая, і я не мог паверыць, што яна ўжо настаўніца. Мне ж самому было толькі дзевятнаццаць, але я адчуваў сябе старым. Яна выглядала яшчэ дзіцем і, напэўна, не разумела, што адбываецца. Магчыма, яна хацела зрабіць хвораму штосьці добрае, але зусім не думала, што тут ляжыць чалавек, перад якім заходзіць свет і які яшчэ раз бачыць сваё юнацтва.

Вечарам, а дзявятай, Герхарт зрабіўся неспакойным. А палове дзясятай стала бачна, што яго цела кідае на барацьбу са смерцю апошнія рэзервы. А дзясятай ён рыпеў, як лакаматыў, пот ручаямі ліў па твары, Герхарт трымцеў і задыхаўся, лёгкія булькаталі, а скрыўленыя вусны хапалі паветра. Потым ён сціх, але застаўся ў прытомнасці.

— Дайце ж яму морфію, каб ён супакоіўся, сястра, — прасіў я.

Яна адмоўна хітнула галавой.

— Гэта супярэчыць веры, — адказала яна.

— Тады дайце мне, — сказаў я. — Гэта ж усяго толькі міласэрнасць! Пакіньце вось тут! Забудзьцеся, калі будзеце выходзіць!

Яна зірнула на мяне.

— Смерць — справа аднаго Бога, — сказала яна і ціха дадала: — А калі не так, то як тут можна вытрываць?

А палове адзінаццатай зрабілася так дрэнна, што я не мог больш на яго глядзець. Я мусіў нешта зрабіць і хутка зразумеў, што.

Як я выйшаў з палаты, не памятаю. Таксама не памятаю, адкуль даведаўся, у якой палаце ляжыць тая дзяўчына. На шчасце, па дарозе мяне ніхто не бачыў. Я не ведаю, што я сказаў ля яе дзвярэй, але яна, мусіць, зразумела, бо пайшла са мной, не задаючы лішніх пытанняў.

Яна села на ложак Брокмана і ўзяла яго потную далонь. Дзяўчына трымцела, але трымалася мужна. І тое, на што я ледзь спадзяваўся, здарылася: Герхарт супакоіўся. Ён і далей хрыпеў, але не так пакутліва.

Начная сястра прыйшла а дванаццатай. Гэтая тлустая жанчына была адзінай, якая нікому не спачувала. Убачыўшы дзяўчыну, яна развярнулася і пайшла назад. Я паспрабаваў усё растлумачыць. Але яна толькі хітала галавой. Шпіталь каталіцкі, тут з такім строга. Для сястры смерць была будзённасцю, нашмат больш незвычайнай была прысутнасць у нашай палаце дзяўчыны.

— Яна не можа тут заставацца, — сказала сястра і паглядзела на мяне.

— Але... — запярэчыў я і паказаў на ложак.

Сястра туды нават не зірнула.

— Хворы ляжыць ціха, — сказала яна. — Пані мусіць ісці! Неадкладна! Яна яму не сваячка!

Дзяўчына пачырванела, вызваліла рукі і хацела падняцца. Але ў гэты момант з вуснаў Герхарта пачуўся гартанны крык, яго скрывіла ад жаху, і мне падалося, што ён кліча нейкую Анну.

— Застаньцеся! — раз'юшана прамовіў я і стаў паміж дзяўчынай і сястрой.

Мне было ўсё роўна, што здарыцца далей.

Сястра затрэслася ад абурэння і звярнулася да дзяўчыны:

— Пані, пакіньце палату! Я сама застануся з хворым.

— Не варта, — жорстка растлумачыў я. — Ён даволі часта зладаваўся на вас.

Яна скіравалася да дзвярэй:

— Тады я мушу паведаміць. Я зараз жа пайду да доктара!

— Ідзі ты да шыбеніка, старая сава! — кінуў я наўздагон.

Напружана, нецярпліва чакаў я, што ж будзе. Я цвёрда вырашыў: ніхто больш не ўвойдзе ў палату. Гэта была толькі нашая з Герхартам справа. Яна не датычыла больш нікога.

Але больш ніхто і не прыйшоў.

Герхарт памёр раніцай, на другія суткі пасля Каляд. Памёр лёгка, у сне. Дзяўчына заставалася з ім, пакуль усё не скончылася. Потым мы моўчкі крочылі праз бляклае снежнае святло калідора. Цяпер, калі ўсё мінула, мне зрабілася цяжка на сэрцы ад размовы з сястрой. Нічога прыемнага ў такіх шпітальных справах не было. Мне, канечне, усё адно, але лепей, калі дзяўчына пакіне бальніцу.

— Спадзяюся, у вас не будзе праз гэта праблем, — сумна вымавіў я.

Яна зрабіла невыразны рух і паглядзела наперад:

— Не мае значэння... У параўнанні з гэтым...

Я зірнуў на яе. У яе быў зусім іншы твар. Вечарам, калі яна спявала з класам, гэта быў твар дзяўчынкі — а цяпер я глядзеў у сур'ёзны, сканцэнтраваны твар чалавека, які шмат ведае і зазнаў пакуты.

Вяртаючыся назад, я ўвесь час думаў пра гэта і дзівіўся: цяпер, калі званы пачалі клікаць да ранішняй імшы, мне ўпершыню з таго часу, як я стаў салдатам, было спакойна. Я адчуваў, што зрабіў нешта добрае, я зноў ведаў, што ёсць нешта, апроч вайны і разбурэння, што гэта вернецца. Спакойна і павольна я вярнуўся ў палату, у якой золатам і шэранню зіхацела святло раніцы. У ложку больш не ляжаў выпадковы салдат Герхарт Брокман. У ложку ляжаў вечны таварыш, і яго смерць ужо не была жахам — яна была запаветам і абяцаннем. Абаронены і супакоены, лёг я побач з ім.

Вы, снежаньскія ночы 1917-га! Вы, ночы пакутаў і шрасці! У вашай невытлумачальнай бядзе прачнулася надзея і воля да чалавечнасці! Вас нельга забываць, вашая перасцярога ў гэтыя дні смуты не павінная быць занядбаная! Ніколі!

Пераклаў з нямецкай
Арцём Арашонак

ЛЕКТОРЫЙ

У ПАЎНАВОДНАЙ ПЛЫНІ, або З ДАЎНІНЫ ДА НАШЫХ ДЗЁН

Генрых ДАЛІДОВІЧ

Такую літаратуру называюць па-рознаму. Дакументальнай, дакументальна-мастацкай, мастацка-дакументальнай альбо і з іншым аўтарскім жанравым азначэннем.

Яна мае ў нас даўні пачатак. Мо і з часоў полацкага князя, кніжніка Ізяслава ці яго сына Брачыслава альбо ўнука Усяслава: пры кімсьці з іх мог павесціся летапіс, які пазней, у войны, зусім не выпадкова знікне са старажытнага Полацка і які яшчэ будзе трымаць у руках рускі гісторык XVIII ст. В. Тацішчаў.

У Беларусі дакументальна-мастацкая (ці з перастаноўкай значэнняў) аснова твора засведчана, бадай, з канца XII ст., калі мо полацкі манах Міхаіл склаў «Жыціе Еўфрасінні Полацкай» (мы ведаем тэкст са спісу ці не XV ст.) і калі, па меркаванні асобных даследчыкаў, той (пазнейшыя перапісчыкі?) пры расказе пра слынную асветніцу мог выкарыстаць і свае назіранні, і яе творы. І ўсё, нават самыя маленечкія падрабязнасці, выйшла неацэннае. Яшчэ выказваецца гіпотэза, што К. Тураўскі напісаў не толькі шмат прытчаў, малітваў, казанняў, а каля 1187 года і «Слова аб палку Ігаравым», дзе ёсць і канкрэтныя эпізоды полацкай гісторыі, асобныя справы славутага Усяслава. Магчыма: тураўчанін быў адзін з самых буйных тагачасных эрудытаў, таленавітых пісьменнікаў і, як ён вобразна зазначаў, «ратаяў слова». Я, сумніцель, схільны лічыць: «Слова» склаў умелы кампілятар Мусін-Пушкін, каб напрыканцы XVIII ст. апраўдаць захоп Кацярынай II беларускіх і многіх украінскіх земляў, што задоўга да дзяржавы «Расія» ўжо мелі сваю дзяржаўнасць. Таму ў мусін-пушкінскіх закліках пра «адзінства» была найперш свая «надзённая ідэалагічная задача»: абгрунтаванне ўзвышэння імперыі і скоранасці новых яе складнікаў.

Да Скарынінскай эпохі сярод прааранага тагачасным афіцыйным словам ярка выдзяляецца перш агульнадзяржаўны хранікальны звод «Летапіс вялікіх князёў літоўскіх» (1430–1446), дзе ў звязцы са старажытнасцю ўсходніх славян была пададзена гісторыя яшчэ маладой дзяржавы на еўрапейскай карце — ВКЛ. Гэты летапіс хораша аблітаратурыла тое, што ягоны аўтар (аўтары) да пазначэння падзей, учынкаў іх удзельнікаў дадаў свае вольнасці, празаічныя элементы: кароткае апісанне прыроды, думак герояў, магчымыя дыялогі паміж імі і інш. (Я. Длугаш выкарыстоўваў летапіс для напісання «Гісторыі Польшчы»).

Ф. Скарына ў прадмовах да перакладу Біблії развіў жанры публіцыстыкі па розных галінах чалавечых ведаў, а таксама каментарыя, анатацыі, а часамі і лірычнай прозы ці вершаў у прозе і ўжыў такія залацінкі беларускай мовы, якія і сёння зіхацяць: «грошы», «досыць», «згода», «кут», «мінулы», «натхненне», «пільнасць», «прамень», «сенажаць», «смутак»... Ён мог браць удзел і ў складанні Статута ВКЛ 1529 года. Ён не мог таксама не натхніць шырока адукаваных на еўрапейскіх дасягненнях, здольных да пяра сучаснікаў, наступнікаў на напісанне сваіх твораў.

XVI і XVII стагоддзі — уздым, нават узлёт нашай літаратуры на старабеларускай (тагачаснай пісьмовай з выкарыстаннем гутарковай), польскай і «трасянковай», лацінскай мовах. Я. Вісліцкі ў «Прускай вайне» (1057 радкоў пра Грунвальдскую бітву, Ягайлу, Вітаўта) імкнуўся са спалучэннем дакументальнасці і мастацкасці, з дапасаваннем вобразна-сімвалічнай сістэмы Антычнасці ўславіць подзвіг продкаў (пра таксама вызначальную Клецкую бітву 1506 года і Аршанскую 1514-га напіша адзін з самых вядомых гісторыкаў Рэчы Паспалітай М. Стрыйкоўскі, калі патрапіць служыць у Беларусь, Літву і азнаёміцца з іх гісторыяй). М. Гусоўскі «Песняй пра зубра» змог здзівіць пераборлівага заходняга чытача не проста дакументальным, а высока паэтычным майстэрствам апісання непаўторнасці, хараства нашай, адрознай ад іншай прыроды, сэнсу і ўцехі палявання, велічы цара нашых лясоў. Складаюцца «Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага» (версія пра паходжанне яго князёў, ідэалагічная спроба ўзвялічыць Аўкштайцію і Жамойць), «Хроніка Быхаўца» (гісторыя ВКЛ прадоўжана да XVI ст.), Баркулабаўскі летапіс (гісторыя Усходняй Беларусі другой паловы XVI — пачатку XVII стст.).

Са з'яўленнем «Перагрынацыі» М. К. Радзівіла (апісаў сваю паездку па многіх краінах да Святой зямлі) і «Дыярыуша» Ф. Еўлашоўскага, які ўспамінамі свайго жыцця з 1564-га па 1604-ы гады заклаў пачатак мемуарыстыкі, ужо можна з поўным правам лічыць усталяванне дакументальна-мастацкай ці мастацка-дакументальнай літаратуры. У XVII ст. гэтая тэндэнцыя, а з ёю і прафесіяналізм творцаў яшчэ больш узмацняцца, што прывядзе да сцвярджэння ў нас дакументальнай, мастацка-дакументальнай, гістарычна-мемуарнай прозы: «Дыярыуш» С. Маскевіча (рэзкаватае апісанне ладу ў Рэчы Паспалітай, тагачаснай Масквы і Смутнага часу), «Дыярыуш» А. Філіповіча (разнастайныя карціны тагачаснага прыватнага і дзяржаўнага жыцця, у тым ліку і рэлігійнага; павышаная роля аўтара як грамадзяніна-палеміста і творчай асобы), «Дыярыуш» А. Каменскага-Длужыка (маскоўскі палон, апісанне змушаных пакутных вандровак па Сібіры і Далёкім Усходзе; гэтае апісанне названых абшараў і для рускай літаратуры ці не адно з самых



ранніх), «Успаміны» Я. Цадроўскага (падзеі 1650–1670 гадоў у ВКЛ, наведванне іншаземных краін), «Магілёўская хроніка» купецкага старасты горада Т. Сурты (яго дапоўняць дзед, сын, унук Трубніцкія і такім чынам адлюструюць у летапісе падзеі з 1526 года па 1856-ы)... Спіс гэты можна доўжыць і доўжыць. І з паэзіі, прамоў, лістоў, інтэрмедый, а пазней і з іншых відаў драматургіі...

У XVII ст. «стары» этап тагачаснай беларускай літаратуры завершыць палачанін С. Полацкі і заадно ў Маскве закладзе новы, які найперш ажывіць рускую літаратуру. У прыватнасці, выступіць пачынальнікам «той галіны мастацкай творчасці, якая да яго была амаль зусім не распрацавана, — паэзіі і драматургіі» (напісана і выдзелена Яроміным І. П.). Праўда, гэта і іншае (выхаванне царскіх дзяцей, наладжванне школы для тагачаснай спецслужбы, друкарні, бібліятэкі) не ўратуе яго ад анафемы тамашніх рэлігійных і свецкіх кансерватараў, з якімі пазней рашучую ідэйную барацьбу павядзе Пётр І. Як ужо і ў XVII ст., у наступным беларуская літаратура пачне абмяжоўвацца ананімнай паэзіяй (сярод паіменаваных аўтараў выдзеліцца Ф. Радзівіл з Нясвіжа, якая стане заснавальніцай першага на беларускіх землях прыдворнага тэатра і першай жанчынай-драматургам у Рэчы Паспалітай). Тэатральнае мастацтва пакліча да развіцця жанру камедыі, персанажы якой у залежнасці ад сацыяльнага стану размаўляюць на розных мовах: лацінскай (ксёндз), польскай (пан), беларускай (селянін), «трасянцы» (яўрэй, цыган).

У XIX ст. у літаратуры, створанай на нашых землях, пэўным чынам аднаўлялася мастацка-дакументальная традыцыя, абуджалася нацыянальная свядомасць у асноўным польскамоўнымі пісьменнікамі (найперш паэмы, вершы А. Міцкевіча пра часы ВКЛ, а таксама балады Я. Чачота, нарысы з вандровак па беларускай зямлі Ул. Сыракомлі, шматлікія этнаграфічныя апісанні, запісы фальклору і г. д.), і сітуацыя паклікала для прыгожага пісьменства на занядбанай, загнанай пад сялянскія стрэхі беларускай мове не аматараў, а прафесійнага пісьменніка (В. Дунін-Марцінкевіч; вяршыняй прызнана творчасць Ф. Багушэвіча). Яна, сітуацыя, таксама вымагала далучэння да польскага паўстання і клічу да народа «Мужыцкай праўдай».

А пасля 1905-га, калі больш за 200 гадоў забароны, з беларускай мовы крыху сцягнулі надмагільную пліту, яна ўміг ажыла, абудзіла духоўнасць, годнасць, літаратуру і культуру! Калі не строга дакументальная, то рэчаісная аснова паўнакроўна выявілася ў многіх вершах і паэмах Я. Купалы, дасягнула непаўторнага мастацкага ўзроўню ў «Новай зямлі» Я. Коласа, натуральна прысутнічае ў нарысах «Лісты з дарогі» Ядвігіна Ш. Многія апавяданні, аповесць «На імперыялістычнай вайне» М. Гарэцкага (а пазней ягоныя «Віленскія камунары» і «Камароўская хроніка») — якасна новы этап развіцця гэтага жанру. Пісьменнік у вышэйназваных першых двух буйных творах так «расшчапіў» рэчаіснасць, перажытыя ім падзеі на Першай сусветнай вайне, грабежніцкай з усіх бакоў, так сродкамі простай, дакладнай ды надзвычай яркай, з залатым россыпам слоў мовы сплавіў розныя стылі ў свой каларытны, што гэтыя творы ўжо не толькі «набліжаюцца да мастацкіх», а з'яўляюцца літаратурай найвышэйшай пробы. Пазней да яе хіба наблізяцца «У кіпцюрох ГПУ» Ф. Аляхновіча, пасляваенныя эсэ і нарысы В. Таўлая (у адным з твораў ён прадбачыць з'яўленне ў будучым тэмы спаленых вёсак), «Веча славянскіх балад» Я. Сіпакова, гістарычныя празаічныя творы і драмы У. Караткевіча, калектыўная кніга «Я — з вогненнай вёскі», паэма «Хамуціус» А. Куляшова. Асобна ганаровае месца ў гэтым пантэоне займае «Споведзь» Л. Геніюш. Сугучна дакумент і мастацкую тканіну выдатна ўжыў І. Мележ у «Подыху навальніцы» пры паказе пачатку калектывізацыі ў палескай вёсцы. Змястоўна папоўнілі дасягненні ў адлюстраванні старажытнай гісторыі В. Іпатава, Л. Дайнека, К. Тарасаў, В. Коўтун. Пэўныя поспехі ў А. Петрашкевіча ў гістарычных п'есах, І. Новікава ў дакументальных аповесцях пра падпольшчыкаў у час Другой сусветнай вайны.

Варты самага прыязнага слова многія гістарычныя эсэ, нарысы, аповесці і раманы, п'есы на тэму гісторыі маладзейшай кагорты пісьменнікаў і тых, хто таксама спрычыніўся да распрацоўкі гісторыка-культурных слаёў і якія ўсе разам паспрыялі па-новаму засвяціцца многім летапісам і іншым як вядомым, так і мала знаным дакументам на глебе іх мастацкага асэнсавання: У. Арлоў, А. Бутэвіч, К. Цвірка, М. Арочка, А. Пашкевіч (пра яго прозу мной апублікаваны асобны артыкул — гл. часопіс «Дзеяслоў», №64), А. Краўцэвіч, А. Курэйчык, Н. Масляніцына і М. Багадзяж, В. Чаропка, В. Хурсік, М. Казлоўскі, С. Чыгрын... Дыханнем больш блізкай і нядаўна абылганай гісторыі літаральна ўзвысілі душу свядомаму чытачу А. Сідарэвіч (праўда пра БНР і аднаго з яе айцоў А. Луцкевіча), Л. Маракоў (мартыралог рэпрэсаваных, знішчаных сталіністамі нашых лепшых сыноў нашага народа), А. Валахановіч (сумесна з У. Міхнюком падрыхтаваў і выдаў «Споведзь у надзеі застацца жывым» — разнастайныя матэрыялы з трагічнага жыцця Б. Тарашкевіча, якога за «саветызм» зневажалі ў польскім сейме і кідалі ў турму, а пасля, у СССР, яго знішчылі як «польскага шпіёна»), Э. Ялугін (расказ пра настойлівае змаганне Зм. Жылуновіча ўтварыць Савецкую Беларусь і пра дзікую расправу з ім сталінскіх апрычнікаў). Свой важкі ўклад унесла «Наша ніва», выдаўшы запісы Г. Кірылавым успамінаў былых пасляваенных навучэнцаў педвучылішчаў у некаторых раёнах Заходняй Беларусі, якіх подла звінавацілі ў антысавецкай дзейнасці і папоўнілі імі ГУЛАГ, чым зрэзалі верхні слой нацыянальна свядомай беларускай моладзі. Нельга не згадаць і кнігу Р. Клімовіча — аднаго з 5 тысячаў беларусаў-вязняў Нарыльска і аднаго з кіраўнікоў паўстання там у 1953-м супраць савецкага рабства. Гэта — вялікая падмога напісаць новыя і дакументальна-мастацкія, і мастацкія творы пра нашых пакутнікаў за чысціню думак, сумленнасць душы, за гарачае імкненне верна служыць свайму народу (як ведаю, адзін наш пісьменнік мае ўжо амаль гатовы раман пра лёс вышэйназванай заходнебеларускай моладзі). Як вялікай падзякі заслугоўваюць і тыя пісьменнікі-навукоўцы, хто спрыяў больш акрэслена пракладаць па цаліне больш абвешкаваны шлях да гістарычных часоў і крыніц: А. Мальдзіс, Г. Кісялёў, М. Ермаловіч, В. Чамярыцкі (ён, напрыклад, адзін з каментатараў, навуковы рэдактар такіх унікальных выданняў, як «Беларускія летапісы і хронікі», «Анталогія даўняй беларускай літаратуры. XI — першая палова XVIII стагоддзя» і інш.), літаратуразнаўцы А. Коршунаў, А. Мельнікаў, Ж. Некрашэвіч і У. Кароткі, а таксама даследчыкі больш блізкіх нашых трагедый: А. Лукашук, І. Кузняцоў, І. Мельнікаў...

РЭЦЭНЗІІ

ЗАПРАШАЕМ У ГАРОДНЮ, У «НОВЫ ЗАМАК»

Ала ПЕТРУШКЕВІЧ

Літаратурныя альманахі ў Гародні маюць ужо стагадовую гісторыю. Першы быў выдадзены ўдзельнікамі Гродзенскага гуртка беларускай моладзі ў 1913 годзе. Захавала і яго, і звесткі пра тое выданне пісьменніца з Беласточчыны Зоська Верас — адна з заснавальнік і актыўных удзельнікаў гуртка.



Цяпер гарадзенскія пісьменнікі атрымалі новы альманах, назва якога «Новы замак». Больш дасканалай для творцаў, большасць з якіх жывуць у адзіным у Беларусі месце, дзе захаваліся каралеўскія замкі, і быць не можа. Стварыў гэты вобраз, канцэпцыю выдання, уклаў альманах гарадзенскі празаік Сяргей Астравец.

Чаму «Новы замак»? Кожны для сябе тлумачыць сэнс гэтай назвы. «Калі мы гаворым «Новы замак», мы бачым спачатку браму. Так, мы апынаемся перад двума сфінксамі, якія яе ахоўваюць. Сфінксы заўсёды маўчаць. Але бачылі яны шмат за свае двесце пяцьдзясят гадоў», — так пачынае сваё ўступнае эсэ Сяргей Астравец. Пра што маўчаць сфінксы? Што адбывалася за гэтаю брамаю? Маю надзею, што і ў творах гэтага выдання ўдумлівы чытач зможа знайсці для сябе адказы.

Для мяне ў назве альманаха адразу пачуўся перазоў з кнігай гарадзенскіх паэтаў «Лабірынты прывіднага замку», выдадзенай крыху больш за дзесяць гадоў. Кожны творца спрабуе ўзвесці свой замак. Але колькі ж даводзіцца паблукаць па ягоных лабірынтах у пошуках і выйсця, і вяршыні, каб часцей за ўсё прыйсці да высновы: усё гэта ёсць толькі прывідам.

«Новы замак» тэматычна атрымаўся гарадзенскім. Хоць аўтары прапаноўвалі свае творы, відавочна, не надта пра гэта задумваючыся. Проста, Гародня — гэта такое места, якое ўплывае на творцаў надзвычайна. Недарэмна ж Хрыстос прызямліўся ў Гародні. Як неадпойны рабіў тое і аўтар вядомага рамана.

Найбольш багатай паўстае паэтычная ніва альманаха. У Гародні традыцыйна многа паэтаў. Пра гэтую старонку шмат гаварылася на прэзентацыі, што сталася знакавай у розных сэнсах: адбылася 21 сакавіка, у сусветны дзень паэзіі, і, зразумела ж, у Новым замку. Працытуем тут артыкул Усевалада Сцебуракі, які дакладна акрэсліў асноўныя адметнасці паэтычных твораў. Альманах «распачынае маладая гарадзенская паэтка Ганна Аўчыннікава, аўтарка кнігі «Ад зачыненай брамы». Далей ідзе нізка вершаў-прысвячэнняў, створаных у адметнай манеры вядомай паэткай Данутай Бічэль. Гэта сапраўдная галерэя партрэтаў Ларысы Геніюш, Адама Станкевіча, Кастуся Тарасава і іншых славутых беларускіх дзеячаў рознага часу. Наогул, варта адзначыць прыемную зместавую і стылёвую разнастайнасць твораў, змешчаных у паэтычным раздзеле альманаха. Тут і светлая лірыка Уладзіміра Васько, і праўдзіва-шчырыя прызнанні Анатоля Валюка, і зараджаныя пазітывам палкія, як маніфесты, вершы Алеся Жамойціна, і напоўненыя жыццёвай мудрасцю творы Яўгена Петрашэвіча, і класічныя трыялеты Алеся Старадуба, і эксперыментальныя таўтаграмы Сяргея Чыгрына».

Дапоўнім гэты пералік згадкай пра глыбокія, без паэтычнага прыхарошвання вершы Юркі Голуба, які шмат зрабіў, каб «Новы замак» паўстаў (альманах, зазвычай, выдадзены пры падтрымцы Саюза беларускіх пісьменнікаў). Назавем яшчэ адно імя — Анатоль Брусевіч. Знакавае для сённяшняй Гародні. Паэт, які стварае цалкам адметны свет. Але ўжо і не стварае. А непарыўна суіснуе з гэтым светам. Бо ўсялякія моманты гульні, штучнасці, забавы з жыццём і паэзіяй адкінуты творцам. Бо занадта многа болю і стратаў шчодра падаравана яму Небам:

Мой свет разарваны на тысячу сказаў.
На тысячу словаў разбіта маўчанне.
Мой Божа, навошта ты дорыш адразу
Так многа адценняў і ценяў адчаю?

Што да прозы, то найперш вылучаецца аповесць-эсэ Сяргея Астраўца «Мармур не смяецца», што падзагалоўкам мае «Гісторыя праз двесце дваццаць год». Твор не для люду паспалітага. Успрымаецца вельмі няпроста. З многіх прычынаў. Найперш з-за неадназначнасці постаці галоўнага героя апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Няпроста зразумець і прыняць аўтарскае стаўленне да свайго, як прынята лічыць, зусім не гераічнага героя. Не спрыяе лёгкасці чытання і складаны сінтаксіс. Але проста патрэбна знайсці своеасаблівы ключ да рытму мастацкай прозы аўтара, каб яе гучанне не было не толькі складаным, а прыносіла сапраўднае задавальненне чытачу.

Зрэшты, аўтар дае багата падказак, як успрымаць ягоны твор, дзе героем не толькі кароль, але і сам каралеўскі горад. Не той рэальны, у якім існуюць месцічы, а створаны аўтарскім разуменнем: «Мой каралеўскі горад для мяне — тэатр у звычайным разуменні і тэатр, дапусцім, гістарычны». Таму і блукае між гэтымі рознымі часавымі пластамі аўтарская думка, вылучаючы істотнае то з часоў даўніх, то з змрочнага сёння.

У традыцыйнай манеры створана апавяданне Валянціна Дубатоўка «Бацька», у якім аўтар шукае і знаходзіць цікавыя сюжэтныя хады, пераплятаючы людскія лёсы. Ставіць героя перад выбарам, калі выбару ў яго няма.

З адметным пачуццём успрымаецца сёння эсэ Юрыя Гуменюка «Цені Бруна Шульца ў Гродне», паэта, які так трагічна-неспадзявана сыйшоў мінулаю завейна-сцюжнаю зімою. Гэта ягоны апошні, прапанаваны да друку, твор. Неістотна, што ён ужо быў надрукаваны ў перыёдыцы. Тут, у гэтым выданні, эсэ вельмі дарэчы. Як падкрэсліў сам аўтар у назве, твор ягоны таксама гарадзенскі. Бо не проста пісаў Юра пра цікавую постаць Бруна Шульца, цікавую для яго, імкнуўся, каб і для іншых яна стала такой жа. Цалкам лагічна і як жа памайстэрску даводзіць ён еднасць эстэтычнае прасторы Гародні і радзімы польскага пісьменніка далёка-блізкага Драгобыча, далёка-блізкага міжваеннага дваццацігоддзя: «Не ведаю, як у іншых беларускіх гарадах, а ў Гродне прысутнасць Бруна Шульца не выклікае асаблівых пярэчанняў, яна вельмі адчувальная. Мабыць, таму, што сам горад, як былая рэзідэнцыя каралёў Рэчы Паспалітай, і як знакавае месца на скрыжаванні розных культур і рэлігійных традыцый, арганічна ўпісваецца ў сістэму шульцаўскіх вобразаў і фантасмагорый. Калі з галавой панурыцца ў дзіўны метафарычны свет пісьменніка<…>, можна пазнаць і «Вуліцу кракадзілаў», і «Цынамонавыя крамы» і, напэўна, тых крыху дэманічна-пажадлівых кабет-манекенаў». Юра якраз і ўмеў «з галавой панурыцца», зайсці ў той свет. І бясконца блукаць у ягоных лабірынтах. Пазначым жа для сябе: працытаванае — гэта апошнія слова гарадзенскага паэта пра ягоны ўлюбёны горад.

Дзённікавыя запісы прафесара Гродзенскага ўніверсітэта Аляксея Міхайлавіча Пяткевіча «Крэскі з мае дарогі» ахопліваюць невялікі па часе пласт (1988–1991), але гэта былі гады надзвычайна напружанага жыцця, калі грамадскія справы літаральна захапілі ў палон вучонага-літаратуразнаўцу. Бо верылася, што з тых намаганняў будзе плён, бо першыя вынікі з'яўляліся. Але як смутна ведаць, што з таго сталася, і колькі не было напісана, не створана аўтарам. Аддадзены былі сілы на алтар беларушчыны, якая ніколі не была ласкавай да сваіх працаўнікоў.

Што да асобна вылучанага раздзелу перакладаў, то ў большасці гэта перастварэнні з польскае літаратуры, што цалкам зразумела: надта цесна пераплецены кантэксты нашых сувязяў. Над перакладамі з паэзіі Адама Міцкевіча, Аляксандра Макрэцкага, Антоні Маслінскага, Чэслава Сэнюха шчыравалі Юрка Голуб і Станіслаў Суднік.

Заключны раздзел альманаха — «Хроніку» літаратурнага жыцця Гародні (і не толькі) апошняга часу — падрыхтаваў Сяргей Астравец. Між іншага вылучым развітальнае слова пра пісьменніка, стваральніка музея Васіля Быкава ў нашым горадзе Мікалая Мельнікава, імпрэзу з нагоды 120-годдзя з дня нараджэння Зоські Верас і прэзентацыю кнігі вершаў «Займеннікі» Едруся Мазько. Паэта, які свае адзінае кнігі не дачакаўся. Паэта, для якога Гародня стала местам заўсёднага вяртання і вялікага кахання. Паглядзіце на здымак гэтага прыгожага паэта, які назаўсёды застаўся маладым, і ўявіце, як ён чытае верш пра ўлюбёны горад:

Святы анёл са шпілю пекнай Фары
Штоночы шпацыруе па Гародні.
І я патрапіў на яго сягоння,
Калі вяртаўся да цябе з вакзала.
І скрозь святло неонавых рэкламаў
Мы моўчкі з ім па вуліцах блукалі
І тое, што не страцілі, шукалі
На польскім бруку, у вітрынах крамаў.

І задумайцеся, хто гэта штоночы шпацыруе па Гародні…

ПРЫЧАСЦІЦЦА ЧЫСЦІНЁЙ

Васіль МАКАРЭВІЧ,
Марына КАРАБЯНКОВА

У маскоўскім выдавецтве «Советский писатель» выйшаў у свет новы зборнік беларускага аўтара Ізяслава Катлярова «Небесная весть», які прыхільна сустрэла крытыка на старонках расійскай «Литературной газеты» (услед за гэтым аўтар быў намінаваны рэдакцыяй гэтага ж выдання на літаратурную прэмію «Залаты Дэльвіг»).



Чым вылучаецца паэзія І. Катлярова? У першую чаргу высокай інтэлігентнасцю і інтэлектам, культурай радка і эстэтычнай далікатнасцю, вытанчанасцю ўспрымання навакольнага свету. Паэта цікавіць самае загадкавае, што здараецца з чалавекам: як ён адчувае сябе на мяжы між жыццём і смерцю, што думае ў гэтыя імгненні, якія пачуцці прыходзяць да яго.

Аўтар умела выводзіць нас з нетраў філасофскіх развагаў, далучае да рэчаіснасці, нашага паўсядзённага жыцця і тых канкрэтных абставінаў: «Иней или ещё паутинка? Ни о чем я судить не берусь». Радкі, на першы погляд, настолькі ценькія, здаецца, выведзены кончыкам чарадзейнай палачкі. Але колькі ў іх эстэтычнай далікатнасці, душэўнай чысціні і аснежнай светласці: «И летит за снежинкой снежинка через всё, о чём думать боюсь…».

Без перабольшвання можна сказаць, што кожны «зімні» верш І. Катлярова – гэта музычная скерца ці маленькая саната, дзе многа святла, прасторы, звонкагалосай сцішанасці і нечага яшчэ таямнічага і шматзначнага, ад чаго на душы робіцца хораша і святочна: «Улёгся в поле дымный ветер на светозарные снега. И только в мареве морозном парят пушистые березы, напоминая облака».

Радуе празрыстасць і натуральнасць гучання вершаванага радка І. Катлярова. Малюнкі прыроды, як і мастацкія дэталі, скупыя, ашчадныя, у нейкай меры аскетычныя і падпарадкаваны адной задачы: настроіць чытачоў на лірычны лад, выклікаць захапленне і ўзрушэнне тымі дзівосамі, на якія багаты навакольны свет, закінуць у душы іскрынку радасці.

Лірычны герой І. Катлярова ведае цану і смак жыцця, думае, разважае, шукае і радуецца, што яму даў Бог шчасце прыйсці на гэты свет, пазнаваць яго сакрэты і таямніцы.

Душэўнай цеплынёй напоўнены радкі, прысвечаныя роднаму Магілёву, дзе прайшло дзяцінства і юнацтва І. Катлярова, а таксама Дняпру, які сваімі водамі абмываў раны і пісягі хлапчука. Не забывае І. Катляроў і пра тое пачуццё, якому «все возрасты покорны», і прысвячае яму радкі не менш гарачыя і шчырыя, як і ў маладосці, прысвячае адной-адзінай – жонцы і паэтэсе Соф'і Шах, з якой ён шчасліва звязаў свой лёс. У адным з вершаў паэт удала абыгрывае імя жонкі і заяўляе: «Ты – Софийский собор, я – лишь твой прихожанин. Есть престол и притвор, есть небесный хозяин»…

Свой штодзённы клопат і занятак паэт ацэньвае так: «Стихосложенье? Нет, стихослуженье». У іншым вершы гаворка ідзе пра тое, што «В славном городе Ерусалиме… Безымянно жили стихари… Но стихи их были знамениты, вслушивались даже и цари в заклинаний колдовские ритмы». Паэт гаворыць і пра сябе: «До сих пор себя мы не поймём – стыдно в этом, Господи, признаться… Не поэтом бы, а стихарём на Руси когданибудь остаться…»

Хіба не мае права пра гэта марыць Ізяслаў Катляроў?

ІНТЭРВ'Ю

Анатоль Бутэвіч: «ГАЛОЎНАЕ, КАБ УБАЧЫЛІ РЭАЛЬНАСЦЬ, ДЫ ЯШЧЭ І ЗАЙМАЛЬНУЮ»

Анатоль Бутэвіч — чалавек у нашай краіне вядомы, публічны. Па-першае, пісьменнік. Працуе ў сферах дзіцячай літаратуры, гістарычнай публіцыстыкі, крытыкі, у галіне перакладаў. Па-другое, старшыня Грамадскай назіральнай камісіі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь, намеснік старшыні Рэспубліканскага грамадскага савета па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, першы міністр інфармацыі, потым міністр культуры і друку Беларусі, дыпламат.



Фота Кастуся Дробава

— Анатоль Іванавіч, кожны творца па-свойму пачынае шлях у літаратуру. Якімі былі вашы першыя крокі?

— Пачынаў з перакладаў гумарыстычных апавяданняў, змешчаных у польскім часопісе «Шпількі», якія друкаваліся ў газеце «Чырвоная змена». Потым доўгі час займаўся дзіцячымі казкамі, перакладаў фантастычныя творы Станіслава Лема, іншых польскіх аўтараў, рабіў пераклады з украінскай мовы і з беларускай на рускую. Крытычныя артыкулы ўвайшлі ў кнігу «Пад небам беларускага слова». Пазней была яшчэ і серыя «Сем цудаў Беларусі» — апавяданні пра помнікі гісторыі і архітэктуры, духоўнае багацце продкаў, знакавыя падзеі і выбітных асоб беларускай зямлі.

— Мне падаецца, гістарычная тэма для вас стала самай галоўнай. Як вы падступаліся да яе?

— Падчас працы Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Румыніі (з 1998 па 2001 год) мае калегі-паслы часта прасілі расказаць пра Беларусь. Мне здавалася, пра нашу краіну, якая стала незалежнай, ужо многія і шмат ведаюць. Аказалася, што не. Ды, зрэшты, мы і самі дагэтуль спазнаём сваю родную старонку. Калі ж я спрабаваў нешта распавядаць калегам, адчуваў, што яны слухаць-то слухаюць, але здзіўлена глядзяць на мяне, калі ўпамінаю імёны Дамейкі, Касцюшкі, Міцкевіча. Чылійцы, прынамсі, запыталіся: «Пры чым вы і нацыянальны герой Чылі Ігнат Дамейка?»— «Усё правільна, Дамейка — герой Чылі, але нарадзіўся ён на беларускай зямлі!» — тлумачу ім. Менавіта тады я зразумеў, што мы — «нацыя донараў», бо аддалі свету многіх выбітных людзей, прытым ва ўсіх сферах. Калі я вывучаў гісторыю ў школе і на філфаку БДУ, выйшла кніга Л. Абэцэдарскага пра беларусаў у Маскве. Аўтар даказаў, што выхадцы з нашай зямлі праявілі сябе як выдатныя майстры. Ёсць дадзеныя, што ў XVII стагоддзі кожны дзясяты жыхар Масквы быў беларусам...

— Вы нарадзіліся на Нясвіжчыне, у легендарным краі, багатым на розныя падзеі. Гэты факт, мабыць, таксама даў моцны штуршок для гістарычных пошукаў...

— Бясспрэчна. Я неадгойчы казаў, што вялікую ролю ў маім жыцці адыграла Сноўская сярэдняя школа, дзе працавалі выдатныя настаўнікі — не толькі прадметнікі, але і заўзятыя краязнаўцы. Аднак у школах 1960-х гадоў, хоць і надышла «хрушчоўская адліга», ва універсітэце 1970-х амаль ніхто не гаварыў пра Вялікае Княства Літоўскае, не ўспамінаў Вітаўта Вялікага. Нават пра Радзівілаў амаль ніхто нічога добрага не чуў. Пазней у Беларускай савецкай энцыклапедыі напісалі: «Радзівілы — гэта прыгнятальнікі працоўнага народа». А вось той факт, што яны — дзяржаўныя дзеячы, якія стваралі Вялікае Княства Літоўскае, выступалі мецэнатамі, спрыялі выданню кніг, развіццю тэатра, ніхто не хацеў прызнаваць. Жывучы каля цудоўнага радзівілаўскага гнязда, я не мог не зацікавіцца гэтай тэмай.

— У вашай творчасці — адметны почырк і ўнікальны стыль. А яшчэ ўдумлівы чытач заўважае, што вам уласцівы асабісты падыход пры напісанні гістарычных твораў...

— Падчас напісання стараюся выкарыстоўваць гістарычную «падсветку», дакладней, абапірацца на дакументальны гістарычны фон. Увесь час мне здавалася, што ў аповесці «Апошняе ігрышча» часу гісторыі не хапае. Пасля зразумеў: гістарычнай дакладнасці. Пры дапрацоўцы другая частка стала дакументальнай. Тут расказваю пра тое, што адбывалася ў Заходняй Беларусі да 1939 года і напярэдадні вайны. Змешчаны толькі дакументы, якія яшчэ не так даўно мелі грыф сакрэтнасці.

Тое ж самае можна сказаць і пра раман «Каралева не здраджвала каралю», прысвечаны чацвёртаму шлюбу семідзесяцігадовага караля польскага і вялікага князя літоўскага Ягайлы з сямнаццацігадовай Соф'яй Гальшанскай. У любой гістарычнай з'яве, падзеі я заўсёды шукаю нешта такое, што зачапіла б асабіста мяне. Арыентуюся больш на эмацыянальны пачатак. Ягайла і Соф'я — пачынальнікі знакамітай польскай ягелонскай дынастыі. Сапраўды так, але кроў у іх жылах цякла тутэйшая! Неабходна прызнаць, што паходзяць яны з нашых зямель! Мне цікава было паказаць, якім чынам наша гісторыя ператваралася ў агульнаеўрапейскую, бо гэтым шлюбам яны паядналіся ў Навагародку (22 лютага 1422 года). Хаця ўсе тры папярэднія шлюбы Ягайлы заключаліся ў Кракаве — сталіцы Польшчы. Прасцей было Соф'і паехаць у Кракаў і там абвянчацца з каралём, тым больш, што адбывалася гэта снежнай зімой. Значыць, такім чынам Ягайла яшчэ раз засведчыў сваю прывязанасць да гэтай зямлі, якой ён не здраджваў да канца сваіх дзён, хацеў аддзячыць ёй за тое, што яна паставіла яго на крыло.

Так, прыняўшы Крэўскую унію, ён мусіў рабіць шмат таго, што патрабавалі палітычныя абставіны, міждзяржаўныя стасункі, не заўсёды на карысць тутэйшай зямлі. Але знарок ён не шкодзіў ні сваёй зямлі, ні свайму народу. І калі сёння кажуць, што пасля Крэўскай уніі адбылася інкарпарацыя ці далучэнне Вялікага Княства Літоўскага ў Рэч Паспалітую, то гэта не зусім так. Пасля таго заключылі больш пяці уній, якія пацвярджалі, што неабходна аб'ядноўвацца! Нават Люблінская унія 1569 года, якая зацвердзіла адну агульную дзяржаву — Рэч Паспалітую, — і то да канца не далучыла Вялікае Княства Літоўскае.

— У Выдавецкім доме «Звязда» рыхтуецца да выхаду ў свет другая частка кнігі «Каралева не здраджвала каралю», але ўжо як дакументальны твор...

— Калі я пачаў пісаць другую частку, якую назваў «Паміж Каронай і Княствам. Ад Крэўскай уніі да Люблінскай», мне хацелася зразумець, што і як адбылося тады ў Княстве і Кароне найперш у дачыненні да нашых зямель, да нашых дзеячаў. І такім чынам пацвердзіць мастацкі тэкст першай часткі. Калі сабраў і сістэматызаваў даты, факты, то пастараўся знайсці для ўсяго гэтага больш шырокі кантэкст. Змяшчаў легенды, меркаванні, каб было цікавей чытаць, а не ўспрымаць кнігу як даведнік. Падаў і сціслы «Ягайлаў часапіс»: даведкі пра краіны, палітычных і дзяржаўных дзеячаў, усё блізкае атачэнне караля. І зноў з чалавечай «падсветкай», з пэўнай цікавосткай.

У канцы выдання змешчаны храналагічны пералік кіраўнікоў Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Маскоўскага княства, Кіеўскай Русі, мітрапалітаў, рымскіх пап і інш. Хацелася адсачыць, як і з кім яны былі звязаныя, як гэта ўплывала на іх дзеянні і дзяржаўную палітыку. І праца над кнігаю не спыняецца. Калі знаходжу нейкую дэтальку, якая дазваляе «ачалавечыць» нашу гісторыю, адразу ўключаю яе ў агульны кантэкст. І гэты працэс бясконцы. Самае галоўнае, каб чытачы ўбачылі рэальнасць, ды яшчэ і займальную.

— У свой час Уладзімір Караткевіч змог захапіць беларускай гісторыяй некалькі пакаленняў тых, хто жыў у савецкія часы.

— Згодзен з вамі. Для мяне Уладзімір Караткевіч — найбольшы гістарычны аўтарытэт. Але трэба ўлічваць той факт, што ён пісаў мастацкую гісторыю Беларусі. Ён у добрым сэнсе легендызаваў беларускую гісторыю. Мы ўсе, хто сёння працуе на ніве гістарычнай літаратуры, пэўным чынам «хрышчаны» Караткевічам, які браў гістарычны факт, з'яву, а далей ствараў мастацкі твор. Для мяне таксама важна, каб на пачатку быў факт, падзея. А далей ідзе ўжо мая ўласная інтэрпрэтацыя. І калі б нашы прафесійныя гісторыкі кіраваліся гэтым, то, упэўнены, мы значна лепш ведалі б айчынную гісторыю і не аддалі шмат чаго суседзям. Я не раз даводзіў айчынным гісторыкам, што, можа, з іх маўклівай згоды, а можа, з нашай агульнай маўклівасці, беларускую гісторыю «запасычылі» сабе суседнія народы. Сёння не трэба адбіраць у іх нашу гісторыю, прысвойваць іх спадчыну. Проста неабходна рэальна ўсведамляць, што, калі і дзеля якой карысці адбывалася. І гэтага будзе дастаткова, каб зразумець, хто мы, адкуль мы. Беларусы былі, ёсць і будуць заўсёды на гэтай зямлі, але ў супольнасці з іншымі народамі. Гісторыя ніколі не была адназначнай, аднамернай. Таму не трэба баяцца паказваць як светлыя, так і цёмныя яе старонкі, але ў тым кантэксце, які ў той час існаваў.

— Летась убачыла свет ваша кніга «Таямніцы Мірскага замка», цяпер з'явілася новае выданне — «Таямніцы Нясвіжскага замка». Ці будзе прадоўжана гэтая серыя?

— Калі я пачынаў пісаць «Таямніцы Мірскага замка», у самім замку немагчыма было купіць хоць нейкае выданне пра яго гісторыю. Праўда, за апошні час сітуацыя крыху змянілася, але нам усё роўна яшчэ далёка да еўрапейскіх стандартаў. Калі хтосьці бывае ў Кракаве, Вільнюсе, то бачыў, колькі там разнастайных кніг пра адзін і той жа аб'ект. Няхай і ў нашай краіне будзе як мага больш выданняў, створаных рознымі аўтарамі і ў рознай інтэрпрэтацыі. Калі пісаў пра Мірскі замак, стараўся знайсці тое, што было яшчэ не вядома. Штосьці нават для сябе адкрыў.

— Вось дзе матэрыял для стварэння сцэнарыяў для беларускіх фільмаў!

— Яны амаль гатовыя. Слова — за ўдумлівымі і крэатыўнымі сцэнарыстамі. Ды і ў тэатрах не шмат гістарычнай тэматыкі. Перш за ўсё мы павінны задаволіць свае патрэбы ў такіх творах, бо, паўтаруся, у сілу розных прычын мы не вельмі добра ведаем уласную гісторыю. Дарэчы, «Таямніцы Мірскага замка» маюць яшчэ адну назву — «Падарожжы па сівых мурах з Адамам Міцкевічам». Гэта была мая знарочыстая знаходка, якую я ўвёў, калі кніга была амаль гатова. У паэме «Пан Тадэвуш» Міцкевіч апісвае менавіта Мірскі замак, хаця і не згадвае яго. Але ўсе дэталі сведчаць: гэта ён. Ды і ўладальнікі Міра рэальныя, пра іх таксама згадвае Адам Міцкевіч.

Што да кнігі «Таямніцы Нясвіжскага замка», то гэта «Падарожжа ўглыб стагоддзяў з Уладзіславам Сыракомлем». Зноў жа я не хацеў браць агульнавядомы матэрыял, пастараўся знайсці менш вядомыя дэталі і з'явы, якія датычаць Нясвіжа ці больш падкрэсліваюць яго ролю ў нашай гісторыі. Дарэчы, на знакамітай карце Макоўскага пазначана Вільня, а над ёю — каралеўская карона. Падобныя кароны змешчаны і над Нясвіжам, Клецкам і іншымі гарадамі, якімі валодалі Радзівілы. Раблю дапушчэнне: паколькі карта выдавалася па загадзе Сіроткі, можа, такім чынам ён хацеў засведчыць «некаранаванасць каралёў» Радзівілаў.

Ужо гатова палова матэрыялу для трэцяй кнігі — «Таямніцы Крэўскага замка». Гэтае падарожжа па нашай гісторыі плануючы здзейсніць з Вітаўтам Вялікім, каб паглядзець на ролю Крэва ў айчыннай гісторыі, якую яшчэ не ацанілі належным чынам. Крэўская унія змяніла еўрапейскую гісторыю, яшчэ больш вывела Вялікае Княства Літоўскае на еўрапейскі прасцяг. Далей, магчыма, будзе Гальшанскі замак.

— Упэўнена, вашы творы абудзяць цікавасць шматлікіх турыстаў да нашай «сівой» спадчыны.

— Але нам нарэшце трэба зразумець, што кожнае значнае турыстычнае месца павінна мець свой брэнд. Напрыклад, калі мы замест «Паехалі ў Гродна» скажам замежнікам: «Паехалі ў каралеўскі горад Гродна», — то гэта прагучыць зусім інакш. Гродна — сапраўды каралеўскі горад, дзе была рэзідэнцыя польскіх каралёў, уладароў ВКЛ, там стаяць два замкі. Тое ж самае з Навагрудкам. Прапануйце сваім гасцям з'ездзіць у першую сталіцу Вялікага Княства Літоўскага, дзе жыў адзіны кароль Княства — Міндоўг, і вы адчуеце іх зацікаўленасць. А Магілёў — гэта ж апошняя стаўка расійскага імператара Мікалая II. Як і Баранавічы, дарэчы. Трэба не толькі знайсці для кожнага горада вызначальную рысу, але і навучыцца яе прапагандаваць.

Раіса МАРЧУК

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by